*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

2 ВЕРАСНЯ 2008 г.
АЎТОРАК
№ 164 (26277)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## РЭСПУБЛІКАНСКАЕ ДАІ Ў ПЕРШАЙ ДЭКАДЗЕ ВЕРАСНЯ РЭКАМЕНДУЕ ВАДЗІЦЕЛЯМ ЕЗДЗІЦЬ З УКЛЮЧАНЫМІ ФАРАМІ

**«З 1 верасня нашы вуліцы запоўнены юнымі пешаходамі і веласіпедыстамі, якія найбольш уразлівыя ў гэты час. Усім удзельнікам дарожнага руху неабходна няўхільна выконваць патрабаванні правілаў дарожнага руху, хуткаснага рэжыму і правілаў манеўравання», — гаворыцца ў паведамленні прэс-службы УДАІ Мінгарвыканкама.**

Акрамя таго, ДАІ рэкамендуе вадзіцелям у першай дэкадзе верасня нават у светлы час сутак ездзіць з уключаным бліжнім святлом фар і падкрэслівае, што парада гэта мае рэкамендацыйны характар. Разам з тым ДАІ нагадвае аб тым, што за знаходжанне ў цёмны час сутак на праезнай частцы без флікера прадугледжваецца штраф у суме да 0,5 базавай велічыні, а ў стане алкагольнага ап'янення — да 3 базавых велічынь.

## ЛЕТНЯЕ НАДВОР'Е ЗНОЎ ВЕРНЕЦЦА Ў БЕЛАРУСЬ

**Пасля дажджлівых, амаль восеньскіх выхадных у Беларусь зноў вернецца лета. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміла начальнік аддзела метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла Парашчук.**

Яна адзначыла, што паўночны вецер, які прынёс з сабой дыханне Арктыкі, зменіцца на паўднёвы, і ў краіне істотна пацяплее. Ужо ў аўторак, 2 верасня, паветра днём у паўднёва-заходніх раёнах прагрэецца да 24 градусаў, а ў сераду, 3 жніўня, цёплае надвор'е распаўсюдзіцца па ўсёй тэрыторыі рэспублікі. Ноччу будзе ад 7 да 13 градусаў, днём — ад 20 да 25 градусаў, па поўдні — да 28 градусаў цяпла. Істотных ападкаў не чакаецца.

У чацвер, 4 жніўня, стане яшчэ цяплей. Па прагнозах, на поўдні Брэсцкай і Гомельскай абласцей слупок тэрмометра зноў дасягне 30-градуснай адзнакі. У паўночна-заходніх раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. Цёплы дзень прагназуецца і ў пятніцу, але з-за вялікай колькасці воблакаў па паўночным захадзе рэспублікі будзе крыху халаднавата: 19—22 градусы цяпла.

Добрае надвор'е захаваецца і ў наступныя выхадныя. Ноччу чакаецца тэмпература ад 11 да 17 градусаў, днём — плюс 20—27 градусаў, па Гомельскай вобласці — да 29 градусаў вышэй за нуль. У Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай, Брэсцкай абласцях пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах — з навальніцамі.

## ЦВК Беларусі 3 верасня пачне разгляд скаргаў на адмову ў рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты

**Аб гэтым паведаміў сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалай Лазавік.**

На першым пасяджэнні будуць абмяркоўвацца звароты прэтэндэнтаў на дэпутацкія крэслы, якія вылучаліся па ўсіх шасці абласцях Беларусі, акрамя горада Мінска. Заявы незарэгістраваных кандыдатаў, якія балаціруюцца па Мінску, Цэнтрвыбаркам разгледзіць 4 верасня.

Паводле слоў Мікалая Лазавіка, на гэты момант у Цэнтральную камісію паступіла 46 скаргаў на адмову ў рэгістрацыі ў якасці кандыдатаў у дэпутаты акруговымі выбаркамамі. Яшчэ некалькі такіх зваротаў можа прыйсці па пошце пазней.

«Найбольш распаўсюджаныя прычыны адмовы ў рэгістрацыі, якія аспрэчваюцца заяўнікамі, — гэта парушэнне парадку збору подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку вылучэнца, выяўленне ў падпісных лістах 15 працэнтаў несапраўдных подпісаў ад колькасці правераных», — адзначыў сакратар ЦВК. Акрамя таго, аспрэчваюцца такія падставы, як факт адсутнасці ў акрузе арганізацыйных структур палітычных партый, якія вылучылі сваіх прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат, неправамоцнасць канферэнцый працоўных калектываў. «Некаторыя лічаць, што неадзначаныя ў дэкларацыі аб даходах і маёмасці транспартныя сродкі, зямельныя ўчасткі, грашовыя сродкі з'яўляюцца неістотнымі недахопамі», — дадаў субяседнік.

«Папярэдняе вывучэнне скаргаў сведчыць, што часам заяўнікі маюць рацыю і памыляцца могуць не толькі вылучэнцы, але і акруговыя камісіі», — адзначыў сакратар Цэнтрвыбаркама. На яго думку, у некаторых прэтэндэнтаў ёсць шанцы быць зарэгістраванымі, калі ЦВК палічыць недастаткова важкімі прычыны для атрыманых імі адмоў. Такім чынам, колькасць кандыдатаў у дэпутаты парламента можа павялічыцца пасля разгляду атрыманых скаргаў.

Нагадаем, што з 365 жадаючых балатавацца ў Палату прадстаўнікоў рэгістрацыю ў якасці кандыдатаў прайшлі 276 чалавек. У ніжняй палаце беларускага парламента налічваецца 110 месцаў.

**БЕЛТА.**

## «ГОМЕЛЬСКАЯ ПРАЎДА» СТАЛА СТАРЭЙШАЙ

**Выйшаў 22-тысячны нумар абласной газеты. А напярэдадні, расказвае яе галоўны рэдактар Сяргей Бяспалы, з Масквы, з Дзяржаўнага цэнтральнага музея сучаснай гісторыі Расіі, прыйшла вестка аб тым, што знойдзены чацвёрты нумар газеты, які датаваны 19 сакавіка 1917 года. Нагадаем, што дзень нараджэння «Гомельскай праўды» лічыўся 12 лістапада таго ж самага года, на восем месяцаў пазней. Газета тады называлася «Известия Гомельского Совета рабочих и солдатских депутатов» і выходзіла ў сярэднім тры разы на тыдзень.**

З першых нумароў яе, акрамя другога, захавалася некалькі. Чацвёрты, за 19 сакавіка 1917 года, знаходзіцца ў Дзяржаўным музеі Рэвалюцыі ў Маскве, № 13 за 16 красавіка — у Ленінградскай публічнай бібліятэцы імя Салтыкова-Шчадрына. Як сказаў Сяргей Бяспалы, чацвёрты нумар газеты па тэхнічных прычынах сёння нельга апублікаваць, а будзе гэта зроблена 12 лістапада, у афіцыйны дзень нараджэння газеты. А ў 22-тысячным нумары «Гомельскай праўды» апублікаваны нумар «Известий Гомельского Совета рабочих и солдатских депутатов» за 20 чэрвеня 1917 года. І яшчэ цікавы факт. Летась, калі газета адзначала 90-гадовы юбілей, супрацоўнікі яе прыклалі шмат намаганняў па аднаўленні яе гісторыі. Тады лічылася, што яе падпісвалі 33 рэдактары, насамрэч жа аказалася амаль 50.

*Калектыў «Звязды» віншуе калег з выхадам у свет 22-тысячнага нумара газеты.*

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

# УЗМАЦНЕННЮ САЦЫЯЛЬНАЙ ПАДТРЫМКІ ПЕДАГОГАЎ У БЕЛАРУСІ БУДЗЕ ЎДЗЕЛЕНА ПРЫЯРЫТЭТНАЯ ЎВАГА

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 1 верасня па традыцыі прыняў удзел ва ўрачыстых мерапрыемствах, прысвечаных Дню ведаў. Кіраўнік дзяржавы пабываў на адкрыцці сярэдняй агульнаадукацыйнай школы № 24 у Мінску.**

Новая школа ў сталічным мікраёне Лошыца, разлічаная на 1020 месцаў, мае мастацка-эстэтычны ўхіл. Яе будаўніцтва працягвалася ўсяго 9 месяцаў, хоць першапачаткова планавалася 16 месяцаў. Спецыялісты адзначаюць высокую якасць работ. На ўзвядзенне гэтага аб'екта было затрачана Br23,5 млрд, з іх больш як Br3,5 млрд — на тэхналагічнае абсталяванне.

Выступаючы перад вучнямі новай школы, іх бацькамі і настаўнікамі, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ў 2009 годзе расходы на адукацыю ў Беларусі будуць павялічаны больш як на трэць у параўнанні з 2008 годам, што прадугледжана праектам бюджэту. Гэтыя сродкі будуць накіраваны на павышэнне зарплаты настаўнікам і выхавальнікам, умацаванне матэрыяльнай базы навучальных устаноў, а таксама на выданне вучэбна-метадычнай літаратуры. Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, за год неабходна падрыхтаваць і выдаць падручнікі з улікам накопленага вопыту і пераходу на адзінаццацігадовую сярэднюю адукацыю.

Прэзідэнт падкрэсліў, што цяпер найважнейшым напрамкам работы будзе ўзмацненне сацыяльнай падтрымкі настаўніцтва. Так, прынята рашэнне аб павелічэнні з 2009 года акладаў школьным педагогам, устанаўленні даплаты маладым настаўнікам і надбавак дырэктарам і завучам школ.

Аляксандр Лукашэнка закрануў таксама пераход сярэдняй школы на адзінаццацігадовы тэрмін навучання. На яго думку, такая сістэма школьнай адукацыі дасць самыя шырокія магчымасці для развіцця здольнасцяў і талентаў вучняў. «Тых, хто перажывае, што іх дзеці нешта страцяць, калі не будзе асобных прафіляваных класаў, ліцэйскіх, гімназічных, хачу запэўніць: ніхто нічога не страціць, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Мы зробім так, каб усе мелі роўныя магчымасці пры навучанні ў школе і пры паступленні ў ВНУ».



Фота БЕЛТА.

Прэзідэнт дадаў, што да наступнага года плануецца завяршыць мадэрнізацыю ўступных тэстаў. «Я вам гарантую, што без усялякага рэпетытара школьнік, які добра вучыцца, зможа паступіць у ВНУ», — сказаў ён.

Гаворачы аб сітуацыі ў школьнай адукацыі ў апошнія гады, кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Намудравалі такога, што і першы клас, як у вядомай песні, стаў накшталт інстытута». Далей так прадаўжацца не магло. «Зыходзячы з думкі бацькоў і настаўнікаў, прынамсі, большасці з іх, было прынята рашэнне спыніць затратныя эксперыменты і вярнуцца да нармальнай адзінаццацігадовай школы», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Пасля завяршэння цырымоніі адкрыцця Прэзідэнт азнаёміўся з матэрыяльна-тэхнічнай базай школы, умовамі для навучання і выхавання школьнікаў, агледзеў школьную сталовую, харэаграфічны і біялагічны класы, трэнажорную, спартыўную і актавую залы, медыцынскі кабінет, а таксама блок пачатковай адукацыі.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што новабудоўля адпавядае самым высокім стандартам: тут створаны цудоўныя ўмовы для заняткаў спортам, музыкай, танцамі, маляваннем, тэатральным мастацтвам у гуртках і секцыях. У ёй зроблена таксама ўсё неабходнае для навучання дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі.

Кіраўнік дзяржавы падараваў школе 10 новых веласіпедаў «Бусел» ААТ «Мотавела» і пакінуў першы запіс у Кнізе ганаровых гасцей школы.

На развітанне Прэзідэнт пажадаў вучням новай школы штодзень атрымліваць радасць ад адкрыццяў, спартыўных і творчых поспехаў, шмат выдатных адзнак у дзённіках, а педагогам — поспехаў у высакароднай працы і неардынарных, дапытлівых, таленавітых вучняў.

**БЕЛТА.**

## І ЗЛОТЫЯ ПАДРОБЛІВАЮЦЬ

Нарадам аховы затрымана жыхарка Баранавічаў, якая прынесла ў аддзяленне «Белпрамбудбанка» польскія злотыя. Злотыя былі выраблены пры дапамозе электракартаграфіі. Жанчына растлумачыла, што фальшыўкі знайшла ў рэчах маці, якая памерла.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## Расія падтрымае Беларусь у ініцыятыве прыняць чэмпіянат свету

**У нядзелю ў мінскім Палацы спорту каманда Прэзідэнта Беларусі выйграла міжнародны аматарскі турнір у межах Фестывалю хакея, узяўшы верх у фінальным паядынку над камандай Аўстрыі з лікам 8:5. Па дзве шайбы ў складзе беларускай дружыны закінулі Павел Белы і Міхаіл Захараў, па разу вызначыліся Уладзімір Цыплакоў, Аляксандр Андрыеўскі, Алег Раманаў і Андрэй Асташэвіч. Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка зрабіў 4 галявыя перадачы.**

Нагадаем, што беларусы на папярэднім этапе сталі лепшымі ў групе А, атрымаўшы перамогі над камандамі Міжнароднай федэрацыі хакея (12:9), Расіі (12:4) і ЗША (13:5). Лепшым бамбардзірам турніру стаў форвард каманды Прэзідэнта Беларусі Міхаіл Захараў, на яго рахунку 17 выніковых балаў (6 шайбаў, 11 галявых перадач). Прэзідэнт набраў на турніры 16 ачкоў (3 шайбы і 13 галявых перадач). Лепшым варатаром турніру прызнаны галкіпер беларускай каманды Аляксандр Гаўрылёнак. Прыз яму ўручыў легендарны савецкі варатар, трохразовы алімпійскі чэмпіён і шматразовы чэмпіён свету Уладзіслаў Траццяк, які ўзначальвае Федэрацыю хакея Расіі. Лепшым абаронцам названы гуляючы трэнер каманды Аўстрыі Гюнтэр Штокхамер, а лепшым нападаючым — форвард беларускай дружыны Павел Белы.

Бронзавым прызёрам міжнароднага турніру сталі расіяне, якія ў паядынку за трэцяе месца абгулялі каманду Славакіі (9:4).

На ўрачыстай цырымоніі закрыцця турніру Уладзіслаў Траццяк сказаў, што ў яго ёсць спецыяльны падарунак для нападаючага дружыны гаспадароў Аляксандра Лукашэнкі . Імяніты госць адзначыў, што кіраўнік беларускай дзяржавы падае выдатны прыклад здаровага ладу жыцця і адданасці хакею. Расія будзе падтрымліваць ініцыятыву Беларусі прыняць чэмпіянат свету, падкрэсліў Вячаслаў Траццяк. Уладзімір Навумаў на цырымоніі закрыцця падзякаваў усім камандам — юнацкім, ветэранскім, аматарскім, гледачам, якія падтрымлівалі гульцоў на трыбунах, а таксама выказаў спадзяванне, што шматлікія замежныя госці яшчэ раз у гэтыя дні пераканаліся ва ўменні беларусаў арганізоўваць міжнародныя турніры на высокім узроўні.

Юнацкая каманда Беларусі на Міжнародным турніры Фестывалю хакея, які праходзіў на арэне ХК «Юнацтва-Мінск» у сталічным парку Горкага, заняла другое месца. У заключным паядынку каманда Беларусі ўзяла верх над дружынай ЗША (7:1) і гарантавала сабе другое месца. Нашы суайчыннікі стартавалі з разгромнага паражэння ад равеснікаў з Татарстана (0:7), а затым рэабілітаваліся, атрымаўшы буйную перамогу над аўстрыйцамі (12:2). Каманда Татарстана выйграла міжнародны турнір, амерыканскія хакеісты занялі трэцяе месца.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## БУМЕР АДНАЎЛЕННЮ НЕ ПАДЛЯГАЕ...

**У цэнтры Магілёва адбылася аўтаавария, вынікі якой уразілі нават інспектараў ДАІ, якія шмат бачылі. Аўтамабіль «БМВ» выехаў на тратуар і ўдарыўся аб выступ падземнага пешаходнага перахода.**

Пашкоджанні, якія атрымаў «чорны бумер», настолькі страшныя, што мімаволі наводзяць на думкі аб ахвярах. Верхняя частка аўтамабіля сплюшчаная, наўрад ці яго ўвогуле можна аднавіць. Аднак людзі жывыя: вадзіцель — 40-гадовы масквіч, яшчэ два расіяніны 40 і 43 гадоў, а таксама тры магіляўчанкі — 22, 23 і 24 гадоў. Жыццё ім захавалі падушкі бяспекі, якія ўсе і належным чынам спрацавалі ў момант аварыі. Пасажыры з траўмамі шпіталізаваныя, вадзіцель увогуле абышоўся лёгкімі пашкоджаннямі і перапудам. Між тым, менавіта паводзіны вадзіцеля сталі прычынай аварыі — за рулём ён быў у стане алкагольнага ап'янення.

**Алена КАЗЛОВА.**

## ШЭРШНІ — ГЭТА НЕБЯСПЕЧНА

**Каля вёскі Пагост-Загародскі на жыхара в. Ганчары ў лесе напалі шэршні.**

Пацярпелага да бальніцы давезлі, але выратаваць 45-гадовага мужчыну не ўдалася — ён памёр у прыёмным пакоі.

Укусы шэршняў рэальна небяспечныя для жыцця, асабліва калі ў чалавека на ўкусы паніжана ахоўная рэакцыя арганізма.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## КАБ НЕ ЗВІНЕЛІ

**Зладзеі залезлі ў магазін в. Міцкевічы Баранавіцкага раёна праз акно. Металічная рашотка не была для іх перашкодай.**

Выкралі тавараў больш чым на тры мільёны. У асноўным бралі кансервы, гарэлку, цыгарэты, каўбасу... Прыцягвае ўвагу той факт, што ўсю гарэлку зладзеі пераліліі з бутэлек шкляных у пластыкавыя. Відаць, каб не звінелі, ды і несці лягчэй.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## ВЫХОДЖУ Я З БІТАЙ НА ДАРОГУ...

**29 жніўня ў цэнтры Магілёва а 3-й гадзіне ўначы на дарогу з драўлянымі бітамі выйшлі два маладыя чалавекі — аднаму толькі споўнілася 18 гадоў, а другі яшчэ і не дацягнуў да 18-га дня нараджэння, бо і сустрэць яго давядзецца за кратамі. Таму што яны ўдваіх напалі на двух мужчын — 26-гадовых магілёўскіх рабочых, і збілі іх бітамі.**

І гэта, як высветлілася пры расследаванні, не проста хуліганства, а разбой: маладыя людзі забралі ў пацярпелых два мабільныя тэлефоны, залаты пярсцёнак і нават не пагрэбавалі тысячай рублёў з вывернутых кішэняў. Хлопцы з бітамі затрыманы, у дачыненні да іх распачата крымінальная справа. За групавы разбой могуць пакараць пазбаўленнем волі на тэрмін ад 6 да 15 гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

**Алена КАЗЛОВА.**

## НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў ВЕРАСНІ

**3, серада,** 16.00—19.00
**5, пятніца,** 14.30—23.00
**6, субота,** 0.00—6.00
**8, панядзелак,** 15.30—19.00
**10, серада,** 12.00—24.00
**11, чацвер,** 0.00—6.00
**13, субота,** 12.00—15.00
**15, панядзелак,** 18.00—20.30
**17, серада,** 21.30—24.00
**18, чацвер,** 0.00—2.00
**19, пятніца,** 21.00—24.00
**20, субота,** 0.00—3.00
**22, панядзелак,** 4.00—6.00
**23, аўторак,** 20.00—24.00
**24, серада,** 0.00—8.00
**26, пятніца,** 10.30—13.00
**28, нядзеля,** 16.30—19.00

**ОАО «Минский завод «Калибр» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**



по продаже 2-этажного кирпичного здания (здание специализированное иного назначения), 1987 г.п., об. пл. 602 кв.м, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, д. 8. (*1-ый этаж* – 4 гаражных бокса пл. от 20 до 29,2 кв.м, складское помещение – 100,9 кв.м, производственное помещение – 78 кв.м, служебные помещения – 62,3 кв.м, металлическая пристройка – 40 кв.м; *2-ой этаж* – административные помещения – 137,7 кв.м.) Начальная цена с НДС – 1 453 000 000 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,1335 га. Задаток в сумме 50 000 000 бел. рублей перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата за объект должна быть произведена в течение 20 календарных дней после подписания договора купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **07.10.2008 г**. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.10.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 224 61 34.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by**

УНП 690324015

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## ГРУЗІЯ ПРЫЗНАЛАСЯ, ШТО ВЫКАРЫСТАЛА Ў ПАЎДНЁВАЙ АСЕЦІІ КАСЕТНЫЯ БОМБЫ



**Грузія прызнала, што падчас агрэсіі супраць Паўднёвай Асеціі яе войскі выкарыстоўвалі касетныя бомбы. Аб гэтым паведамілі заходнія агенцтвы са спасылкай на заяву ваеннага эксперта міжнароднай праваабарончай арганізацыі Human Rights Watch Боні Дачэрці.**

Касетныя боепрыпасы ўжываліся ў раёне Рокскага тунэля, які злучае Паўночную і Паўднёвую Асеціі, паведамляе АР са спасылкай на афіцыйны ліст Мінабароны Грузіі. У Тбілісі заявілі, што выкарысталі касетныя бомбы М85. Такая ж зброя масава выкарыстоўвалася Ізраілем у вайне з баевікамі «Хізбалах» у 2006 годзе, адзначае агенцтва. Паводле інфармацыі праваабаронцаў, у выніку ўжывання касетных боепрыпасаў у Паўднёвай Асеціі «мінімум 14 мірных жыхароў загінулі, тысячы параненыя». Раней Human Rights Watch абвінавачціла ў выкарыстанні касетных бомбаў Расію, аднак у Генштабе гэтыя сцвярджэнні аспрэчылі.

Нагадаем, міжнароднае заканадаўства забараняе выкарыстанне касетных боепрыпасаў супраць грамадзянскіх аб'ектаў.

## ЗША НАПАДУЦЬ НА ІРАН У БЛІЖЭЙШЫЯ ТЫДНІ?

**Галандская спецслужба адклікала ўсіх сваіх супрацоўнікаў з Ірана ў сувязі з маючай адбыцца ўзброенай аперацыяй ЗША супраць Тэгерана, піша галандская De Telegraaf.**

Служба знешняй разведкі Нідэрландаў спыніла ўсе аперацыі па ўкараненні ў абаронны комплекс Ірана і арганізацыі сабатажу. «Аперацыя, якая характарызуецца як выключна паспяховая, была нядаўна спыненая ў сувязі з планамі ЗША нанесці паветраныя ўдары па Іране», — паведамляе выданне, якое цытуе брытанская The Daily Telegraph. Высокапастаўленая крыніца паведаміла выданню, што важны агент быў нядаўна адкліканы з Ірана, бо ЗША, верагодней за ўсё, прымуць рашэнне атакаваць Іран з дапамогай беспілотных самалётаў на працягу найбліжэйшых тыдняў.

Намеснік начальніка Генштаба іранскіх узброеных сілаў, брыгадны генерал Масуд Джазайеры папярэдзіў у мінулыя выхадныя, што напад на Іран прывядзе да трэцяй сусветнай вайны. ЗША не выключаюць магчымасці ваеннага нападу на Іран, калі ўрад Ісламскай Рэспублікі працягне ўзбагачэнне ўрану ў рамках мірнай ядзернай праграмы, якую заходнія краіны лічаць толькі прыкрыццём стварэння ядзернай зброі. Іран папярэдзіў, што ў выпадку вайны перакрые стратэгічны Хармузскі заліў, галоўны транспартны калідор нафты Ірана.

У пятніцу ізраільская газета Maariv напісала, што калі на працягу бліжэйшага года міжнародныя санкцыі або амерыканскі напад на Іран не спыняць іранскую ядзерную праграму, Ізраілю давядзецца знішчаць іранскія ядзерныя аб'екты самастойна.

## ЭКСПЕРТЫ: ПАДПАЛАМ НА ВАЕННЫХ СКЛАДАХ У ЛАЗАВОЙ МАГЛІ СХАВАЦЬ БУЙНУЮ НЯСТАЧУ СНАРАДАЎ

**Пажар на складах боепрыпасаў паблізу горада Лазавая ва Украіне мог адбыцца ў выніку падпалу з мэтай схаваць нястачу снарадаў. Аб гэтым паведамляе NEWSru.ua са спасылкай на меркаванне падпалкоўніка Генадзя Лабады, які доўгі час служыў у ракетных войсках стратэгічнага прызначэння.**



«Я лічу, што тэхнагенная катастрофа здарылася з-за халатнасці вайскоўцаў — гэта па-першае. А па-другое, склад маглі адмыслова падпаліць, каб схаваць недахоп снарадаў. Калі знікаюць боепрыпасы, лепшы спосаб адвесці ад сябе падазрэнні — нешта падарваць і нястачу спісаць на надзвычайнае здарэнне», — лічыць падпалкоўнік. З гэтай нагоды кампартыя Украіны абвінаваціла прэзідэнта Віктара Юшчанку ў спробе такім чынам «замесці сляды» незаконных паставак зброі ў Грузію.

Нагадаем, надзвычайнае здарэнне на тэрыторыі вайсковай часці ў Лазоўскім раёне Харкаўскай вобласці адбылося ў мінулую сераду. У выніку ўзгарання пачалі выбухаць скрыні з боепрыпасамі. Зона здарэння была ачэпленая сіламі МУС у радыусе трох кіламетраў, насельніцтва эвакуявалі. Усе цягнікі, якія ішлі праз станцыю Лазавая, былі пушчаныя ў абыход. Паведамлялася толькі аб адным пацярпелым вайскоўцы.

## ПА́РА, ШТО СТАЛА НЕБЯСПЕЧНАЙ

**Жыхар вёскі Бранавічы Слуцкага раёна трапіў у рэанімацыю, згодна з папярэднімі данымі, з-за парушэння правілаў эксплуатацыі ацяпляльнага катла на цвёрдым паліве.**

Ім не карысталіся ўсё лета і перад пачаткам не быў правераны ўзровень вады ў награвальным баку агрэгата. Гаспадар дома знаходзіўся ў памяшканні кацельні, калі адбыўся выбух. Мужчына атрымаў апёкі другой-трэцяй ступені: пацярпела 45 працэнтаў цела. Пра здарэнне паведаміў сваяк, што жыў паблізу, які пачуў гучны выбух. Пацярпелы цяпер у цяжкім стане знаходзіцца ў Слуцкім РТМА.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## СПАТЫКНУЛАСЯ НА ЛЕСВІЦЫ

**Старшая выхавальніца аднаго аздараўленчага лагера, што пад Баранавічамі, вырашыла зазірнуць да знаёмых, якія былі ў лагеры па суседстве.**

Жанчына спатыкнулася на лесвіцы, якая вяла ў медізалятар і ўпала.

У гарадской бальніцы пацярпелую выратаваць не ўдалося. Ад атрыманых траўмаў яна памерла.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## ВЯСКОВЫЯ ЛЕБЕДЗІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Выпадак папоўніў падвор'е ў вёсцы Каленкавічы Камянецкага раёна прыгожым белакрылым птаствам. Год таму ў полі пад сенакасілку патрапіў вывадак. На шчасце, ніводнае птушаня не пацярпела ад тэхнікі. Механізатар прынёс дадому вывадак і стаў выходжваць, спадзеючыся, што вырастуць гусі. Аднак, як у той казцы, з брыдкага качаняці атрымалася вялікая і статная птушка. «На жаль, за гэты час стратаў пазбегнуць не ўдалося, — кажа гаспадыня сядзібы Ірына Ражыцкая. — Некалькі птушак загінулі пад коламі вясковых аўталіхачоў. А гэтыя птушкі — ён і яна, — спадзяёмся, прывядуць нам нашчадкаў». Гаспадыня таксама паведаміла, што цяпер, дзякуючы лебедзям, чужынцам уваход у дом забаронены.

*Ірына РАЖЫЦКАЯ з 10-гадовым сынам Ігарам і свойскімі лебедзямі.*

ISSN 1990 - 763X

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 02.09.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 111,00 |
| 1 еўра | 3 093,67 |
| 1 латвійскі лат | 4 395,63 |
| 1 літоўскі літ | 895,84 |
| 1 чэшская крона | 124,62 |
| 1 польскі злоты | 926,34 |
| 1 расійскі рубель | 85,58 |
| 1 украінская грыўня | 451,31 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 24,6670 |
| 10 UAH | 52,8032 |
| 1000 BYR | 11,6795 |
| EUR | 36,1248 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 01.09.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

## Прэзідэнт Беларусі зацвердзіў Асноўныя напрамкі грашова-крэдытнай палітыкі краіны на 2009 год

**Прэзідэнт Беларусі 29 жніўня зацвердзіў Асноўныя напрамкі грашова-крэдытнай палітыкі краіны на 2009 год.**

Як і ў папярэднія гады, у 2009 годзе мэта грашова-крэдытнай палітыкі — абарона і забеспячэнне ўстойлівасці беларускага рубля, яго пакупной здольнасці і курсу адносна замежных валют.

Прадугледжваецца прывязка курсу беларускага рубля да замежных валют (еўра, долар ЗША і расійскі рубель). Пры гэтым прагназуецца, што змяненне афіцыйнага абменнага курсу рубля да долара ЗША складзе плюс-мінус 5 працэнтаў, стаўка рэфінансавання да канца 2009 года не перавысіць 10—12 працэнтаў гадавых, стаўкі па нававыдадзеных банкамі крэдытах — 13—15 працэнтаў гадавых, па новапрыцягнутых тэрміновых дэпазітах — 10—12 працэнтаў гадавых.

Прырост рублёвай грашовай масы складзе 34—38 працэнтаў, шырокай грашовай масы — 32—40 працэнтаў, рублёвай грашовай базы — 28—34 працэнты, рэсурснай базы банкаў — 35—42 працэнты.

Крэдытаванне банкамі эканомікі ўзрасце на 36—44 працэнты. Пры гэтым аб'ём інвестыцыйнага крэдытавання дасягне Br7—7,5 трлн. Крэдытаванне банкамі жыллёвага будаўніцтва ацэньваецца ў Br2,9—3,8 трлн. Прыярытэтным напрамкам застанецца крэдытаванне банкамі экспартаарыентаваных арганізацый, праектаў і важнейшых мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі на 2005—2010 гады, жыллёвага будаўніцтва. Далейшае развіццё атрымае спажывецкае крэдытаванне.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Беларускія спартсмены пакінулі дастойны след на пекінскай старонцы алімпійскага летапісу

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Старшыню Кітайскай Народнай Рэспублікі Ху Цзіньтао і ўвесь кітайскі народ з заслужанай спартыўнай перамогай нацыянальнай каманды Кітая на XXIX Алімпійскіх гульнях.**

«Паспяховае правядзенне XXIX Алімпійскіх гульняў стала магчымым дзякуючы вялікай падрыхтоўчай рабоце, праведзенай кіраўніцтвам Кітайскай Народнай Рэспублікі, а таксама шчыраму энтузіязму і высокаму душэўнаму ўздыму, з якімі ўсе прадстаўнікі кітайскага грамадства рыхтаваліся да Алімпіяды, — адзначаецца ў пасланні. — Бліскучая арганізацыя алімпійскіх мерапрыемстваў такога небывалага маштабу, эстэтычнага ўзроўню і эмацыянальнага напалу, як цырымонія адкрыцця Алімпіяды, пацвярджае, што сучаснаму Кітаю пад сілу любыя самыя грандыёзныя здзяйсненні — і ў сферы спорту, і ў сферы палітыкі, і ў сферы эканомікі.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларускія спартсмены са свайго боку таксама зрабілі ўсё магчымае, каб пакінуць дастойны след на пекінскай старонцы алімпійскага летапісу.

Кіраўнік беларускай дзяржавы таксама выказаў удзячнасць Ху Цзіньтао за тое, што, нягледзячы на насычаны графік работы, ён знайшоў магчымасць правесці двухбаковую сустрэчу, у ходзе якой былі абмеркаваны найбольш актуальныя пытанні развіцця беларуска-кітайскіх адносінаў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Беларусь — Кітай: трывалае партнёрства

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Генадзь Навіцкі сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь У Хунбінем, які пакідае нашу краіну праз тры гады знаходжання на пасадзе.**

Генадзь Навіцкі падзякаваў У Хунбіню за плённае супрацоўніцтва і выказаў надзею на далейшае дынамічнае развіццё ўзаемаадносінаў паміж краінамі як на парламенцкім, так і на вышэйшым узроўнях. Старшыня Савета Рэспублікі нагадаў, што за апошнія гады Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ажыццявіў два візіты ў Пекін, і падкрэсліў, што тавараазварот паміж краінамі павялічыўся амаль у два разы.

Варта нагадаць, што Кітайская Народная Рэспубліка — адзін з важных знешнегандлёвых партнёраў Рэспублікі Беларусь. Па выніках мінулага года гэта краіна заняла 5-е месца па аб'ёме тавараазвароту, 7-е — па экспарце Беларусі і 3-е — па імпарце сярод краін далёкага замежжа. Беларусь экспартуе ў Кітай калійныя ўгнаенні, кар'ерныя самазвалы і запчасткі да іх, электронныя інтэгральныя схемы і мікразборкі, металічную, хімічную, станкабудаўнічую і прыборабудаўнічую прадукцыю. Асноўнымі групамі імпарту з КНР з'яўляюцца абсталяванне, камплектуючыя вырабы і матэрыялы для беларускіх вытворчасцяў, арыентаваных на экспарт, спажывецкія тавары. Шэраг беларускіх прадпрыемстваў мае сваіх прадстаўнікоў і дылераў у Кітаі: ЗАТ «Беларуская калійная кампанія», РУП «Мінскі трактарны завод», ВРУП «Мінскі завод калёсных цягачоў», ВА «Беларускі аўтамабільны завод», НВА «Інтэграл», РУП «Беларускі маторны завод», ВА «Гомсельмаш», РУП «Авіякампанія «Трансавіяэкспарт», ААТ «ААБ Беларусбанк» і Беларуская гандлёва-прамысловая палата.

У ліпені гэтага года ў нашу краіну паступіў першы перавод часткі сродкаў, выдаткаваных кітайскім бокам на будаўніцтва Гомельскага кардыялагічнага цэнтра.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Курсанты Ваеннай акадэміі прынялі прысягу

У Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь прынялі прысягу 633 першакурснікі. Гэты хвалюючы дзень будуць заўсёды памятаць і ўсе пяцьдзясят хлопцаў-першакурснікаў авіяцыйнага факультэта. А разам з імі — Наталля Малашанка, першая дзяўчына ў Беларусі, якая паступіла на лётную спецыяльнасць. Як расказаў падпалкоўнік Мікалай Бондараў — начальнік курса, на які паступіла Наталля Малашанка, прыём дзяўчат на авіяцыйны факультэт сёлета ажыццяўляўся ўпершыню. Акрамя Наталлі на факультэт паступалі яшчэ чатыры прадстаўніцы цудоўнага полу, але яны не прайшлі медыцынскую камісію.

**Таццяна КАРАЛЁВА, «Мінск—Навіны».**

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне начальніку галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Дзядух Таццяне Уладзіміраўне з прычыны напаткаўшага яе вялікага гора — смерці БАЦЬКІ.**

**Рэдакцыя газеты «Звязда» выказвае шчырае спачуванне начальніку галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Дзядух Таццяне Уладзіміраўне з прычыны напаткаўшага яе вялікага гора — смерці БАЦЬКІ.**

***Внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Белгорхимпром» состоится***

**12 сентября 2008 года в 11.00**

*по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале (3 этаж)*

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

*1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.*

*Регистрация акционеров с 9.00 до 10.30.*

*Проект решения собрания по вопросу повестки дня находится по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, ком. № 616.*

***Справки по тел. (017) 334 77 24, Занимонская Галина Георгиевна.*** УНН 600024712

**ОАО «Минский приборостроительный завод»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже недвижимости, расположенной в г. Минске по пр. Независимости, 58: комплекса зданий корпусов №№ 19, 19а, 40, общей площадью 7 045,3 кв. м.

Начальная цена продажи — **21 058 920 000** рублей РБ с НДС.

Задаток в размере 2 % от начальной цены объекта перечисляется на расчетный счет ОАО «Минский приборостроительный завод» № 3012000620011 в филиале ОАО «БПС-Банк» г. Минск, код 334, УНП 100363840.

Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона.

**Аукцион состоится 11 сентября 2008 года в 13.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58.** Заявления и необходимые документы принимаются по 17.00 10 сентября 2008 г. по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58, ком. 603.

**Справки по тел. 8 017 293 94 40, факс 8 017 331 41 97.**

# Аляксандр ЛУКАШЭНКА: «БЕЛАРУСЬ БУДЗЕ РАЗВІВАЦЬ ЗДАБЫЧУ КАЛІЙНЫХ УГНАЕННЯЎ»

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 30 жніўня зрабіў рабочую паездку ў Салігорск, дзе прыняў удзел ва ўрачыстых мерапрыемствах з нагоды 50-годдзя горада і вытворчага аб'яднання «Беларуськалій».**

Кіраўнік дзяржавы ўручыў Ганаровы дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь вытворчаму аб'яднанню «Беларуськалій» за працоўныя дасягненні і важкі ўклад ва ўмацаванне эканамічнай магутнасці краіны.

Прэзідэнт таксама прыняў удзел у адкрыцці спартыўна-відовішчнага комплексу ў Салігорску, а затым — у праведзеным тут хакейным матчы паміж камандай Прэзідэнта Беларусі і ветэранамі хакея ЗША, які адбыўся ў рамках Фестывалю хакея.

РУП «ВА «Беларуськалій» — адзін з найбуйнейшых у свеце і самы буйны на тэрыторыі СНД вытворца калійных мінеральных угнаенняў. За сем месяцаў 2008 года ВА «Беларуськалій» выпусціла 5,2 млн тон калійных угнаенняў, або 103,5 працэнта да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года. Апошнія некалькі гадоў прадпрыемства выкарыстоўвае вытворчыя магутнасці на 100 працэнтаў. Акрамя мінеральных угнаенняў аб'яднанне выпускае тэхнічную, харчовую і кармавую кухонную соль. Найбуйнейшыя спажыўцы беларускіх мінеральных угнаенняў — Бразілія, Індыя, Польшча, Кітай, Нарвегія. За апошнія тры гады аб'яднанне паставіла хлорысты калій у 87 краін свету, у гэтым годзе — больш як у 40 краін. Праграма развіцця прадпрыемства прадугледжвае да 2015 года павелічэнне штогадовай вытворчасці калійных угнаенняў да 9,65 млн тон, або на 18 працэнтаў больш у параўнанні з 2007 годам.

Аляксандр Лукашэнка асабліва адзначыў, што на вытворчым аб'яднанні «Беларуськалій» выпускаецца кожная сёмая тона калійных угнаенняў у свеце. Гэтыя лічбы сведчаць аб тым, што беларускае прадпрыемства ўпэўнена займае лідзіруючыя пазіцыі на сусветным рынку калійных угнаенняў.

Прэзідэнт пазітыўна ацаніў той факт, што тут па-гаспадарску клапоцяцца аб перспектывах дынамічнага развіцця вытворчасці. У прыватнасці, пастаянна мадэрнізуюцца абагачальныя фабрыкі, абнаўляецца тэхналагічнае абсталяванне руднікоў, павышаецца якасць выпускаемай прадукцыі, нарошчваецца экспартны патэнцыял.

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што калектыву аб'яднання трэба рэалізаваць маштабныя задачы па будаўніцтве Чырвонаслабодскага і Бярозаўскага руднікоў, увод якіх намечаны на 2009—2012 гады.

«Перакананы, што вы справіцеся з гэтымі задачамі, таму што разумееце значнасць гэтых праграм для краіны, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Яркім сведчаннем таму з'яўляюцца ўзрастаючыя аб'ёмы інвестыцый, асноўная крыніца якіх — уласныя сродкі прадпрыемства. Гэта таксама сведчыць аб эфектыўнасці гаспадарання і трывалым фінансавым становішчы аб'яднання».

Звяртаючыся да шахцёраў, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што дзякуючы іх працы асноўнае багацце нетраў эфектыўна служыць беларускаму народу. Так, даходы ВА «Беларуськалій» ад экспарту калійных угнаенняў за сем месяцаў гэтага года дасягнулі $2 млрд, у той час як за ўвесь мінулы года валютная выручка склала больш як $1,3 млрд.

Прэзідэнт лічыць таксама станоўчым той факт, што прадпрыемства не забывае і пра патрэбнасці аграрнага сектара: гаспадаркі краіны поўнасцю забяспечваюцца калійнымі ўгнаеннямі.

Кіраўніцтва аб'яднання паспяхова вырашае не толькі вытворчыя, але і сацыяльныя пытанні, адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Значныя сродкі выдзяляюцца на паляпшэнне ўмоў працы, быту, арганізацыю адпачынку шахцёраў, членаў іх сем'яў і ўсіх гараджан.

Аляксандр Лукашэнка прыгадаў сваё першае наведванне прадпрыемства ў сярэдзіне 1990-х гадоў: «Тады яно перажывала, як вы памятаеце, далёка не лепшыя часы. Мы вымушаны былі з-за таннасці калійных угнаенняў на сусветных рынках спыніць іх продаж. Склады былі завалены».

«Тады было прынята радыкальнае рашэнне — адмовіцца ад усіх пасрэднікаў, як у Беларусі, так і ў Расіі. Гэта дало магчымасць не толькі прывесці ў парадак аб'яднанне, але і пачаць асваенне новых руднікоў, — сказаў Прэзідэнт. — Не паддаўшыся ў крытычны момант на заклікі падбухторшчыкаў і асобных апазіцыянераў, мы перамаглі».

Аляксандр Лукашэнка перакананы, што Беларусь павінна выкарыстаць сітуацыю росту сусветных цэнаў на калійныя ўгнаенні. «Мы будзем развіваць здабычу калійных угнаенняў. Мы запрашаем сусветныя кампаніі да супрацоўніцтва, але будзем дакладна праводзіць лінію ў інтарэсах дзяржавы, горада і працоўных аб'яднання», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Прэзідэнта, цяперашняе пакаленне працоўных «Беларуськалія» паспяхова рэалізуе пастаўленыя задачы, нарошчвае вытворчы патэнцыял прадпрыемства, асвойвае новыя радовішчы, забяспечвае дабрабыт горада і ўсёй краіны.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, прадпрыемства стала адным з самых перспектыўных і эканамічна моцных у краіне менавіта дзякуючы працавітасці, майстэрству, прафесіяналізму шахцёраў. «Прадпрыемства ведаюць і цэняць як надзейнага партнёра не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт паведаміў, выступаючы перад працаўнікамі ВА «Беларуськалій» і Салігорска, што ў Беларусі заснавана ганаровае званне «Заслужаны шахцёр Рэспублікі Беларусь». Гэта быў прыемны падарунак шахцёрам напярэдадні іх прафесійнага свята. Прэзідэнт выказаў перакананасць, што работнікі «Беларуськалія» будуць і надалей прадаўжаць слаўныя традыцыі беларускіх шахцёраў, а іх поспехі стануць прыкладам для іншых працоўных калектываў краіны.

Пасля сустрэчы з салігорскімі працаўнікамі Прэзідэнт азнаёміўся са станам і развіццём спорту і турызму ў горадзе і Мінскай вобласці ў цэлым. Кіраўніка дзяржавы праінфармавалі аб ходзе будаўніцтва спартыўна-відовішчнага комплексу ў Салігорску, аб прынятых мерах па добраўпарадкаванні горада, а таксама аб сацыяльна-эканамічным развіцці «Беларуськалія».

Будаўніцтва комплексу пачалося ў кастрычніку 2007 года, а канчатковае яго завяршэнне плануецца на снежань 2008 года. Ён складаецца з чатырох блокаў: лядовай арэны, універсальнай спартыўнай залы, пераходнай галерэі і асобнай крытай аўтастаянкі. Пабудавана першая чарга комплексу з лядовай арэнай, прызначанай для правядзення вучэбна-трэніровачных заняткаў, спаборніцтваў па хакеі, фігурным катанні, а таксама відовішчна-масавых мерапрыемстваў.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што больш як 30 спартыўна-відовішчных комплексаў будзе ўзведзена ў бліжэйшыя 3—4 гады ў раённых цэнтрах Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з інфраструктурай новага спартыўна-відовішчнага комплексу і прыняў удзел у цырымоніі яго адкрыцця.

Прэзідэнт лічыць сімвалічным, што гэты комплекс адкрываецца ў Год здароўя. «Перакананы, што ён будзе садзейнічаць далучэнню гараджан да актыўных заняткаў фізічнай культурай і спортам, стане магутным фактарам выхавання дзяцей і моладзі. Для Салігорска гэта вельмі важна, таму што амаль палавіна жыхароў горада — моладзь», — сказаў Прэзідэнт.

Разам з тым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што гэта не проста лядовая пляцоўка для заняткаў хакеем і фігурным катаннем, а грамадскі цэнтр, дзе можна праводзіць любыя мерапрыемствы. Праз 3—4 месяцы будзе ўведзена ў строй другая чарга комплексу.

Прэзідэнт выказаў удзячнасць усім, хто прымаў удзел у яго будаўніцтве і абнаўленні Салігорска, і ў першую чаргу — калектыву ААТ «Будтрэст № 3 ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі», аднаму з лепшых у краіне.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў розныя гады на самых буйных сусветных спаборніцтвах абаранялі гонар краіны спартсмены Міншчыны, у тым ліку Салігорскага раёна.

Прэзідэнт выказаў перакананасць, што дзякуючы новаму спарткомплексу прадстаўнікі Салігорска заявяць аб сваіх спартыўных дасягненнях.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Навапалацк адзначае юбілей

**50-ы дзень нараджэння гарадскія ўлады не сталі прывязваць да канкрэтнай даты. Адзначаць яго навапалачане пачалі яшчэ ўчора, 1 верасня, і прадоўжаць да канца тыдня. Усяго ў праграме святкавання юбілею — звыш 50 мерапрыемстваў.**

У Дзень ведаў у Наваполацку, акрамя традыцыйных урачыстых лінеек і свята першага званка, адбылося адкрыццё помніка А.С. Пушкіну ля дзіцячай бібліятэкі імя паэта. Таксама 1 верасня пачаў працаваць музей сістэмы адукацыі горада. Сёння ў Наваполацку — свята «Юнацтва горада», падчас якога адбудзецца святочны канцэрт «Дзень юнага музыканта», адкрыецца выстава мясцовых мастакоў «Усе колеры палітры», а таксама экспазіцыя «На Беларусі рок жыве», прадстаўленая з архіваў вядомага музыканта, дырэктара фестывалю «Рок-кола» Сяргея Анішчанкі.

3 верасня прысвечана здароваму ладу жыцця. У гэты дзень у Наваполацку пройдзе шэраг спаборніцтваў па лёгкай атлетыцы, валейболе, футболе, біятлоне і г.д. Завершыць праграму канцэрт Беларускага дзяржаўнага ансамбля «Песняры». 4 верасня да свята далучацца прадстаўнікі розных творчых сфераў. Таксама з Днём працаўнікоў нафтавай, газавай і паліўнай прамысловасці павіншуюць навапалачан папулярныя беларускія артысты.

Бліжэй да выхадных гулянні набудуць масавы размах. З пятніцы Навапалацк ператворыцца ў горад-свята, дзе знойдзецца месца і новым скульптурам (ля помніка «Першая палатка»), і новым кнігам (свой зборнік «Так і жыву: спяваю, мару, плачу...» прэзентуе землякам ураджэнец Полацка, вядомы пісьменнік Навум Гальпяровіч), і святочнаму канцэрту, і водна-спартыўнаму святу. У суботу і нядзелю, як чакаецца, да гасцей горада далучацца дэлегацыі з гарадоў-пабрацімаў Навапалацка (а яны ёсць у Расіі, Польшчы, Літве і нават Францыі). Тады і пачнецца Свята — менавіта з вялікай літары.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## МАЎЧАЛІ СНАРАДЫ, МАЎЧАЛІ ГРАНАТЫ

322 было іх — розных калібраў і відаў. А маглі б калі-небудзь і грымнуць. Калі б у вайсковую часць 5525 не паступіла інфармацыя аддзела ваеннай контрразведкі КДБ Беларусі аб тым, што побач з адным населеным пунктам Гомельскага раёна знаходзіцца схованка так званых чорных капальнікаў. Гэтыя боепрыпасы часоў Вялікай Айчыннай вайны былі знішчаны.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

**по продаже объектов, входящих в состав имущественного комплекса учреждения «Санаторий-профилакторий писателей «Ислочь» (СПП «Ислочь»)**

| Наименование предмета аукциона | Здания, сооружения, передаточные устройства, транспортные средства, входящие в состав имущественного комплекса СПП «Ислочь» |
|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | Минская обл., Воложинский р-н, д. Раков. |
| Продавец недвижимого имущества | СПП «Ислочь». |
| Характеристика предмета аукциона | **1 лот: Главный корпус** – трехэтажное кирпичное здание, фундамент из сборных ж/б блоков, перегородки кирпичные (облицованные камнем), перекрытия из сборных ж/б плит, крыша мягкая рулонная. Здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением, электроосвещением, вентиляцией, канализацией, радио, телефоном, телевидением;<br>**Жилые дома в двух уровнях (коттеджи № 1, № 2, № 3)** – двухэтажные кирпичные дома, фундаменты из сборных ж/б блоков, перегородки кирпичные, перекрытия из ж/б плит, крыша мягкая рулонная. Здания оборудованы центральным отоплением, водоснабжением, электроосвещением, вентиляцией, канализацией, радио и телевидением;<br>**Финская баня** - одноэтажное кирпичное здание, фундамент из ленточных ж/б блоков, перегородки кирпичные (оштукатуренные), перекрытия из ж/б плит, крыша мягкая рулонная. Здание оборудовано отоплением, холодным и горячим водоснабжением, электроосвещением, вентиляцией и канализацией;<br>**Хозяйственный корпус** – одноэтажное кирпичное здание, включающее в себя: котельную, работающую на твердом топливе, гараж на 6 автомобилей, прачечную, хозяйственно-складские помещения; фундамент из ленточных ж/б блоков, перегородки кирпичные (оштукатуренные), перекрытия из сборных ж/б плит, крыша мягкая рулонная. Здание оборудовано центральным отоплением, водоснабжением, электроосвещением, вентиляцией, канализацией, телефоном;<br>**Здание контрольно-пропускного пункта** – одноэтажное деревянное здание, фундамент бетонный, стены деревянные, перекрытия деревянные, крыша мягкая рулонная. Здание оборудовано электроосвещением;<br>**Служебное помещение (пристройка к теплице)** – одноэтажное кирпичное здание, фундамент бетонный, перегородки кирпичные, часть конструктивных элементов уничтожена пожаром (крыша);<br>**Овощехранилище** – здание полузаглубленное, обвалованное грунтом;<br>**Канализационная насосная станция** – одноэтажное кирпичное здание;<br>**Комплекс сооружений** – дорожные покрытия, артскважина, насосно-пневматическая установка, резервуары для воды 2х100 м. куб., подъемные резервуары для хранения топлива, иловая площадка, поля фильтрации, канализационный 2-ярусный отстойник, благоустройство, ограждения, малые архитектурные формы, озеленение, металлическая теплица.<br>**Инженерные сети** – сети электроснабжения 0,4 кв. и 10 кв., сети охранной и пожарной сигнализации, сети заземления и молниезащиты, наружное освещение площадки, внеплощадочные и внутриплощадочные сети связи, внутриплощадочный водопровод, водопровод напорной канализации, переливной трубопровод, хозфекальная канализация, тепловые сети.<br>Все объекты 1986 года постройки.<br>**Транспортные средства:** ГАЗ 5312 (1986 г.), ГАЗ 5312 (1991 г.), ПАЗ 672М (1984 г.), РАФ 2231-01 (1989 г.), ВАЗ 2121 Нива (1987 г.), ВАЗ 32063 (1993 г.). |
| Начальная цена единого предмета аукциона, руб. | 2 740 775 000 (два миллиарда семьсот сорок миллионов семьсот семьдесят пять тысяч) белорусских рублей, в том числе НДС – 418 084 200 (четыреста восемнадцать миллионов восемьдесят четыре тысячи двести) белорусских рублей. |
| Сумма задатка, руб. | 550 000 000 (пятьсот пятьдесят миллионов) белорусских рублей. |
| Оплата | 30 рабочих дней после подписания договора купли-продажи. |
| Организатор аукциона | Госкомимущество, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, тел.: 2881152, 2881156. |
| Справочно: | Продаваемые объекты расположены на земельном участке, равном 26,7 га, находящемся у СПП «Ислочь» на праве постоянного пользования (после изъятия земельных участков, необходимых для обслуживания жилого дома, переданного Воложинскому райисполкому, и гаражного кооператива размер земельного участка будет уточнен), в случае сохранения целевого использования объекта за приобретателем объекта сохраняется право постоянного пользования земельным участком, в случае изменения целевого использования — Воложинским райисполкомом могут быть изменены условия пользования земельным участком. |

Аукцион состоится **2 октября 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, 5 этаж, актовый зал (здание Госкомимущества).

**1. Для участия в аукционе представляются:** заявление на участие в аукционе по установленной Госкомимуществом форме и подписанное с Госкомимуществом соглашение.

**2. К участию в аукционных торгах допускаются негосударственные юридические лица, индивидуальные предприниматели,** представившие следующие документы:

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет учреждения «Санаторий-профилакторий писателей «Ислочь» № 3015035940016 филиал 529 «Белсвязь» АСБ «Беларусбанк» г. Минск, код 720. УНП 600041518;

негосударственным юридическим лицом – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации;

негосударственным иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

Представителям:

индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальный предприниматель Республики Беларусь, в том числе представитель негосударственного юридического лица, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**3. Ознакомление с подлежащими продаже объектами:** по предварительной договоренности, по рабочим дням по 25 сентября 2008 года включительно, контактный телефон 8 029 764 51 57.

**4. Аукционная комиссия имеет право не допустить к участию в аукционных торгах юридическое лицо, победившее в предыдущем аукционе и не выполнившее условия договора купли-продажи, а также юридические лица им учрежденные (его учредившие).**

**5. Участник, ставший победителем аукциона, после проведения аукциона обязан:** подписать протокол о результатах аукциона в день аукциона, после чего в течение 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи.

***Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, каб. 507 (Госкомимущество), с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (рабочие дни) по 25 сентября 2008 года включительно.***

## Абзац

■ Мусульмане ўсяго свету ўступілі ў перыяд рамадану — месяца строгага паста і малітваў. Сёлета свяшчэнны для паслядоўнікаў ісламу месяц прадоўжыцца да 29 верасня і завершыцца святам Ураза-байрам.

■ **Рознічныя цэны на цукар-пясок у Беларусі з 30 жніўня павялічаны ў сярэднім на 5 працэнтаў. Згодна з пастановай Міністэрства эканомікі № 177, рознічная цана на вагавы цукар-пясок складае Br1930 за 1 кг, на цукар-пясок, расфасаваны ў поліэтыленавыя або папяровыя пакеты па 1 кг, — Br2100 за 1 кг. Апошні раз цэны на цукар павышаліся ў канцы чэрвеня на 5 працэнтаў.**

■ Сёлета летам у Беларусі патанулі 233 чалавекі.

■ **Нацыянальная авіякампанія «Белавія» і ізраільская кампанія «Эль-Аль» у лістападзе пачнуць выконваць сумесны авіярэйс Мінск—Тэль-Авіў. Пагадненне бакі падпішуць у верасні.**

■ Паблізу вёскі Жукаўка Мінскага раёна вадзіцель «Рэно» выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з «Фольксвагенам». У выніку абодва вадзіцелі і 8-гадовы хлопчык загінулі, а пасажыры, дзве жанчыны і мужчына, трапілі ў бальніцу. Усяго за мінулыя выхадныя адбылося 98 ДТЗ, у якіх 23 чалавекі загінулі, 124 атрымалі цялесныя пашкоджанні. ДТЗ адбыліся па віне п'яных вадзіцеляў.

■ **Адзіная ў Беларусі гасцініца для птушак «Ластаўка» ў Слоніме пашырылася і можа прымаць больш крылатых наведвальнікаў. Тут з'явіліся новыя клеткі для драпежных птушак і тых, хто не можа жыць па суседстве са сваімі сабратамі — напрыклад, вялікай сініцы, якая даволі агрэсіўная і можа забіваць дробных птахаў. Пастаяльцамі гасцініцы становяцца хатнія птушкі, а таксама птушкі з разнастайнымі траўмамі — буслы, якія не змаглі мігрыраваць у цёплыя краіны, параненыя совы, стрыжы, каршуны. Пасля выздараўлення птушак адпускаюць на волю.**

■ Тры спартыўныя самалёты разбіліся з інтэрвалам у некалькі гадзін у паўднёва-германскай зямлі Бадэн-Вюртэмберг. Чатыры чалавекі загінулі, яшчэ чацвёра атрымалі цяжкія раненні. Першы самалёт упаў у вадаём, пілот і пасажыр загінулі. Праз дзве гадзіны згубіў кіраванне і ўпаў на зямлю самалёт, на борце якога знаходзіліся чатыры чалавекі. Двое з іх, уключаючы пілота, загінулі на месцы, жанчыну і дзіця ўдалося выратаваць — яны шпіталізаваныя з цяжкімі траўмамі. А яшчэ праз 2,5 гадзіны здзейсніў аварыйную пасадку на полі самалёт, у якога сапсаваўся рухавік. Пілот і пасажыр атрымалі траўмы, але засталіся жывымі. Паліцыя праводзіць расследаванне серыі няшчасных выпадкаў.

■ **Перад пагрозай разбуральнага ўрагану «Густаў» два мільёны чалавек былі вымушаныя эвакуявацца з паўднёвага ўзбярэжжа амерыканскіх штатаў Тэхас, Луізіяна, Місісіпі і Алабама ўглыб краіны.**

## Поўны абзац

■ **У лонданскім універмазе «Хародс» пакупнікам прапануюць марожанае са смакам традыцыйных брытанскіх страў. Сярод 20 гатункаў можна знайсці марожанае са смакам шатландскага хагіса (цялячы рубец з вантробамі і прыправамі), вэнджанай рыбы, сасісак з тоўчанай бульбай, грэнак з сырам і соусам і г.д. Усё марожанае вырабляецца з натуральных інгрэдыентаў. Прасцей за ўсё, па словах стваральнікаў, аказаўся смак пясочнага пячэння, а самым складаным апынуўся смак вэнджанай рыбы. Як мяркуюць кулінары, такое марожанае з'яўляецца не дэсертам, а, хутчэй, дадаткам да асноўнай стравы. Так, марожанае са смакам рыбы добра спалучаецца з вэнджаным ласосем, кропам і сырам.**

■ Жыхар кітайскага горада Фуцын па імені Ху зманіў свайму суседу, пакляўшыся ў прысутнасці шматлікіх суседзяў перад Богам, што не браў у доўг. Праз хвіліну яго ўдарыла маланка. Сусед Ху сцвярджаў, што апошні ўзяў у яго тры гады таму 500 юаняў (каля $80) на вясельны падарунак для сябра, а цяпер адмаўляе гэта. Сусед сказаў: калі Ху паклянецца перад Богам, што не браў грошай, ён даруе доўг. Пасля таго, як Ху прамовіў клятву, яго ўдарыла маланка. Пацярпелага тут жа адвезлі ў бальніцу, дзе ўрачы пацвердзілі, што яго моцна ўдарыла маланка. Зараз яго здароўе паляпшаецца.

■ **Партугальскі футбаліст італьянскага «Ювентуса» Цьягу Мендэш зачыніў прэзідэнта клуба ў туалеце. Апошняму давялося прабыць у прыбіральні больш чым паўтары гадзіны. Вызваліў яго адзін з гульцоў, які праходзіў міма і пачуў гучныя грукі ў дзверы. Сваім учынкам Цьягу паспрабаваў адпомсціць кіраўніку клуба за спробу прадаць яго ў каманды, якія не бяруць удзел у розыгрышы галоўнага еўракубка. У выніку Мендэш значна губляў у заробку.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

## Калыхала мяне маці





**Напэўна, ніхто з дарослых не памятае сябе ў калысцы. Ніхто не здольны прыгадаць свае першыя дні, калі калыска, нібы маленькі ўтульны човен, адплывала ў будучыню па імклівай рацэ, імя якой Жыццё.**



Шкада, што не існуе музея калысак (ва ўсякім разе падчас сваіх вандровак такога музея я не сустракаў). Шкада, бо разглядаючы гэтае нескладанае прыстасаванне, можна падарожнічаць у часе — бачыць не толькі сваё дзяцінства, але і ўяўляць побыт іншых — слухаць калыханкі, хатнія размовы...

— У нашых вёсках калыханкі надта ж меладычныя, — казала мне народны майстар з Акцябрскага раёна Тамара Станіслаўчык, — і ў лад ім самі калыскі плаўных абрысаў, нібы музычныя інструменты. Часам дзіцячы ложак плялі з гнуткіх дубцоў лазы, ракіты, што яшчэ больш надавала вырабу лёгкасці і прыгажосці (Тамара прапануе сфатаграфаваць сваю мініяцюрную версію старажытнай калыскі, якую зрабіла з жытнёвай саломкі). Пад галоўку немаўляці абавязкова хавалі які-небудзь абярэг — напрыклад, такога вось чалавечка таксама плеценага з саломкі.

— А ці ўтульна малому ў такой люльцы, калі яна выраблена з аднаго кавалка дрэва? — спытаўся я ў Вікторыі Драпезы з вёскі Валосавічы гэтага ж Акцябрскага раёна. Маладая жанчына прапанавала пасядзець у люльцы свайму сыну Уладзіку, які (гэта бачна на фотаздымку) застаўся вельмі задаволены такой старажытнай мэбляй.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**

### Анонс

## Беражлівая вытворчасць і яе складнікі

Развіццё сучаснага рынку з пастаянным абвастрэннем канкурэнтнай барацьбы вымушае кіраўніцтва многіх прадпрыемстваў шукаць шляхі рэарганізацыі бізнэсу з мэтай зніжэння затрат вытворчасці і сабекошту прадукцыі. Некаторыя ў гэтым накірунку ўжо зрабілі вялікі крок: максімальна знізілі энерга- і матэрыялаёмістасць вытворчасці. Але гэта далёка не ўсё. Для паспяховага развіцця неабходна сістэмнае і пастаяннае ўдасканаленне кожнага працэсу кожным работнікам, што дасць магчымасць выключыць страты часу, перамяшчэння, складзіравання, транспарціроўкі. Гэтыя страты прысутнічаюць у любым працэсе стварэння прадукцыі ці паслугі, але вельмі часта застаюцца незаўважанымі. Тэхналогія «Беражлівай вытворчасці» скіравана якраз на пастаяннае зніжэнне страт і комплекснае ўдасканаленне вытворчага працэсу.

3—4 кастрычніка ў Мінску пройдзе II Міжнародны форум «Беражлівая вытворчасць: малыя затраты — вялікія эфекты». Яго мэта — абмен вопытам у галіне эфектыўнага зніжэння затрат, павышэння прадукцыйнасці, павелічэнне эфектыўнасці выкарыстання рэсурсаў. Прыкладам паслужаць прадпрыемствы краін СНД, на якіх укараняліся тэхналогіі «Беражлівай вытворчасці».

Арганізатар форуму, кансультацыйная кампанія «Ключавыя рашэнні», сёлета значна пашырыла аўдыторыю і па галіновай спецыялізацыі, і па геаграфіі. Сярод экспертаў і ўдзельнікаў — Дэніс Хобс, аўтар кнігі «Тыпавы план укаранення беражлівай вытворчасці», ЗША, прадстаўнікі прадпрыемстваў СП ТАА «Святавіт», Мінск; «АЎТАВАЗ», Тальяці; ААТ «Каменск-Уральскі Металургічны Завод»; ААТ «Заволжскі маторны завод»; ЭВА «Сігнал», Энгельс, УП «Белкамунмаш» Мінск і інш. Эксперты форуму дапамогуць удзельнікам акрэсліць план укаранення прынцыпаў «беражлівай вытворчасці», выбраць інструменты для яго рэалізацыі, ацаніць вынікі рэалізаваных мерапрыемстваў.

Больш падрабязную інфармацыю аб II Міжнародным форуме «Беражлівая вытворчасць: малыя затраты — вялікія эфекты» можна атрымаць на сайце кампаніі «Ключавыя рашэнні» www.kronsult.org.

Афіцыйныя партнёры: «Сантакі інжынерныя тэхналогіі», «Софтформ», друкарня «Арт-Прынт».

Генеральныя медыя-партнёры: Альфа-радыё, газета «Аргументы і факты».

Афіцыйныя медыя-партнёры: TUT.BY, газеты «Звязда», «Нацыянальная Эканамічная газета», «Рэспубліка», «Топ-Персона», часопісы «Цэны і тавары сёння», «Фінансавы дырэктар», «Тэхналогіі перапрацоўкі і ўпакоўкі», электронны часопіс «Штодзённік», БЕЛТА.

ЗВЯЗДА 2 верасня 2008 г.

# ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ РЭГУЛЯВАННІ ВЫТВОРЧАСЦІ І АБАРОТУ АЛКАГОЛЬНАЙ, НЕХАРЧОВАЙ СПІРТАЗМЯШЧАЛЬНАЙ ПРАДУКЦЫІ І НЕХАРЧОВАГА ЭТЫЛАВАГА СПІРТУ

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 27 чэрвеня 2008 года*
*Адобраны Саветам Рэспублікі 28 чэрвеня 2008 года*

Гэты закон накіраваны на ўдасканаленне прававых і арганізацыйных асноў дзяржаўнага рэгулявання ў сферы вытворчасці і абароту алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту ў Рэспубліцы Беларусь.

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 1. Сфера прымянення гэтага Закона**

1. Гэты Закон прымяняецца да адносін у галіне вытворчасці і абароту алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту, а таксама да іншых адносін, непасрэдна звязаных з такой дзейнасцю.

2. Дзеянне гэтага Закона не распаўсюджваецца на:

вытворчасць і абарот піва з аб'ёмнай доляй этылавага спірту 7 і больш працэнтаў (за выключэннем палажэнняў падпунктаў 1.10, 1.12, 1.14, 1.15, 1.17 пункта 1, пункта 3 артыкула 11, артыкула 25 гэтага Закона);

выраб у хатніх умовах фізічнымі асобамі віна, настоек і лікёраў, прызначаных для ўласнага спажывання;

вытворчасць і абарот лекавых і ветэрынарных сродкаў (за выключэннем антысептычных лекавых і ветэрынарных сродкаў), вырабаў медыцынскага прызначэння.

**Артыкул 2. Асноўныя тэрміны і іх азначэнні, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Законе**

Для мэтаў гэтага Закона выкарыстоўваюцца наступныя асноўныя тэрміны і іх азначэнні:

акцызная марка Рэспублікі Беларусь (далей — акцызная марка) — бланк строгай справаздачнасці з пэўнымі ступенямі абароны, прызначаны для маркіроўкі алкагольных напояў, якія выраблены ў Рэспубліцы Беларусь або ўвозяцца на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь;

алкагольная прадукцыя — каньячны, пладовы і этылавы спірт, які атрымліваецца з харчовай сыравіны, алкагольныя напоі і састаўныя спіртовыя паўфабрыкаты для іх вытворчасці (вінаматэрыялы, зброджана-спіртаваныя і спіртаваныя сокі, настоі, морсы і водна-спіртовыя экстракты, канцэнтраваныя харчовыя асновы, араматызатары харчовыя), іншыя паўфабрыкаты з аб'ёмнай доляй этылавага спірту 7 і больш працэнтаў;

алкагольныя напоі — гарэлка, лікёра-гарэлачныя вырабы, віно, каньяк, брэндзі, кальвадос, шампанскае і іншыя напоі з аб'ёмнай доляй этылавага спірту 7 і больш працэнтаў;

дзяржаўнае рэгуляванне вытворчасці і абароту алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту — сістэма мераў па вызначэнні парадку вытворчасці і абароту алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту і забеспячэнні дзяржаўнага кантролю за вытворчасцю і абаротам алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, што ўстанаўліваецца гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь;

кантрольная марка — бланк строгай справаздачнасці, прызначаны для дадатковай маркіроўкі алкагольных напояў, прамаркіраваных акцызнымі маркамі, што вывозяцца з абарачэння;

кантрольны знак — бланк строгай справаздачнасці, прызначаны для маркіроўкі суправаджальных дакументаў на ўвазныя (вывазныя) на мытную тэрыторыю Рэспублікі Беларусь з мытнай тэрыторыі дзяржаў — удзельніц Дагавора аб мытным саюзе і Адзінай эканамічнай прасторы ад 26 лютага 1999 года юрыдычнымі асобамі алкагольную прадукцыю (за выключэннем ўвозу (вывазу) піва з аб'ёмнай доляй этылавага спірту 7 і больш працэнтаў, увозу алкагольных напояў, маркіраваных акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь, вывазу алкагольных напояў, маркіраваных іх вытворцам у адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства краіны прызначэння) нехарчовую спіртазмяшчальную прадукцыю і нехарчовы этылавы спірт;

нехарчовая спіртазмяшчальная прадукцыя — дэзінфекцыйныя сродкі, антысептычныя лекавыя і ветэрынарныя сродкі, парфумерна-касметычная прадукцыя, тавары бытавой хіміі і іншыя віды нехарчовых прадуктаў у выглядзе раствораў, эмульсій, суспензій, вырабленыя з выкарыстаннем этылавага спірту з усіх відаў сыравіны, іншых спіртазмяшчальных прадуктаў, з аб'ёмнай доляй этылавага спірту 7 і больш, але не больш за 80 працэнтаў (за выключэннем лекавых і ветэрынарных сродкаў, вырабаў медыцынскага прызначэння, фарбавальнікаў, пігментаў, пестыцыдаў і іншых аграхімічных прадуктаў, фарбаў, лакаў, эмаляў і іншых аналагічных прадуктаў, прызначаных для атрымання пакрыццяў, друкарскай фарбы, масцікі, гліцэрыны), парфумерна-касметычная прадукцыя, антысептычныя лекавыя і ветэрынарныя сродкі з аб'ёмнай доляй этылавага спірту больш за 80 працэнтаў па пераліку тавараў з указаннем кода Таварнай наменклатуры знешнеэканамічнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь, зацверджанаму Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

нехарчовы этылавы спірт — этылавы рэктыфікаваны тэхнічны спірт, этылавы дэнатураваны спірт, які атрымліваецца з харчовай і нехарчовай сыравіны, іншыя віды нехарчовых прадуктаў з аб'ёмнай доляй этылавага спірту больш за 80 працэнтаў (за выключэннем пабочных прадуктаў спіртавой прамысловасці, фарбавальнікаў, пігментаў, пестыцыдаў і іншых аграхімічных прадуктаў, фарбаў, лакаў, эмаляў і іншых аналагічных прадуктаў, прызначаных для атрымання пакрыццяў, друкарскай фарбы, масцікі, гліцэрыны, а таксама лекавых і ветэрынарных сродкаў, вырабаў медыцынскага прызначэння і парфумерна-касметычных сродкаў з аб'ёмнай доляй этылавага спірту больш за 80 працэнтаў) па пераліку тавараў з указаннем кода Таварнай наменклатуры знешнеэканамічнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь, зацверджанаму Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

абарот — экспарт, імпарт, захоўванне алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту, аптовы і (або) рознічны гандаль імі;

арыгінальныя алкагольныя напоі — алкагольныя напоі, выробленыя на нетрадыцыйнай тэхналогіі з прымяненнем народных рэцэптаў у культурна-этнаграфічных цэнтрах, нацыянальных парках і запаведніках, іншых аб'ектах Рэспублікі Беларусь у мэтах узнаўлення паўнаты беларускіх нацыянальных традыцый;

перамяшчэнне тавару — змяненне месцазнаходжання тавару на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, за выключэннем транзіту, з выкарыстаннем транспартных сродкаў або без іх;

пашкоджаная акцызная марка — акцызная марка, нанесеная ў адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства Рэспублікі Беларусь на спажывецкую тару (упакоўку), у якой разліты алкагольныя напоі і якая пад уздзеяннем знешніх фактараў атрымала механічныя пашкоджанні (разрывы, надрывы, страту часткі маркі і г.д.), хімічныя пашкоджанні (разбурэнне юніграмы, паперы, змяненне колеру, іншых сродкаў абароны і г.д.), тэрмічныя пашкоджанні (выгаранне, абгаранне і г.д.) або іншыя пашкоджанні, але якая захавала пры гэтым серыю і нумар, што дазваляюць яе ідэнтыфікаваць;

спецыялізаваныя магутнасці — комплект абсталявання, у тым ліку асноўнага тэхналагічнага, неабходнага для вытворчасці пэўнага віду алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту;

спецыяльная марка — марка, прызначаная для маркіроўкі алкагольных напояў, затрыманых або ліквідаваных праваахоўнымі і кантралюючымі органамі, а таксама канфіскаваных або вернутых у даход дзяржавы іншым спосабам;

спецыяльны знак — маркіравальная метка, якая ўяўляе графічна-інфармацыйную выяву, нанесеную з дапамогай кроплева-струйных апаратаў;

сродкі кантролю — абаронныя тэхнічныя сродкі, выкананыя ў выглядзе знака ўстаноўленай формы з матэрыялаў, якія забяспечваюць немагчымасць несанкцыянаванай замены блока фіскальнай памяці прыбораў уліку алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту або змянення ў ім фіскальных даных;

фальсіфікаваныя алкагольныя напоі — алкагольныя напоі з наўмысна змененымі іх вытворцам і (або) асобай, якая ўцягвае дадзеныя напоі ў абарот, саставам, уласцівасцямі і характарыстыкамі, інфармацыя аб якіх, што прадстаўляецца ўказанымі асобамі, з'яўляецца загадзя няпоўнай і недакладнай.

**Артыкул 3. Меры дзяржаўнага рэгулявання вытворчасці і абароту алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту**

1. Да мераў дзяржаўнага рэгулявання вытворчасці і абароту алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту адносяцца:

ліцэнзаванне дзейнасці, звязанай з вытворчасцю і абаротам алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту;

устанаўленне квот на вытворчасць алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту;

устанаўленне патрабаванняў да якасці і бяспекі алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту;

дзяржаўная гігіенічная рэгістрацыя і абавязковае пацвярджэнне адпаведнасці алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне тэхнічнага нармавання і стандартызацыі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;

дзяржаўная рэгістрацыя асноўнага тэхналагічнага абсталявання для вытворчасці алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту;

рэгуляванне цэнаў на алкагольную прадукцыю;

устанаўленне акцызаў на алкагольную, нехарчовую спіртазмяшчальную прадукцыю і нехарчовы этылавы спірт у адпаведнасці з падатковым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

маркіроўка алкагольных напояў акцызнымі маркамі, і (або) спецыяльнымі маркамі, і (або) спецыяльнымі знакамі;

маркіроўка суправаджальных дакументаў на ўвоз (вывоз) алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту кантрольнымі знакамі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;

устанаўленне парадку дэкларавання аб'ёмаў выробленых, выкарыстаных і нявыкарыстаных, рэалізаваных і нерэалізаваных, экспартаваных, імпартаваных і (або) паступіўшых алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту;

устанаўленне дзяржаўнага кантролю за вытворчасцю і абаротам алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту;

замацаванне за дзяржавай выключнага права на ажыццяўленне імпарту алкагольнай прадукцыі;

іншыя меры, прадугледжаныя гэтым Законам.

2. Актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь могуць быць прадугледжаны іншыя меры дзяржаўнага рэгулявання вытворчасці і абароту алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту.

**Артыкул 4. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне вытворчасці і абароту алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту**

1. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне вытворчасці і абароту алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту складаецца з гэтага Закона, актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

2. Калі нормамі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь устаноўлены іншыя правілы, чым тыя, якія прадугледжаны гэтым Законам, то прымяняюцца правілы міжнародных дагавораў.

## ГЛАВА 2
## ПРАВА НА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ ДЗЕЙНАСЦІ, ЗВЯЗАНАЙ З ВЫТВОРЧАСЦЮ І АБАРОТАМ АЛКАГОЛЬНАЙ, НЕХАРЧОВАЙ СПІРТАЗМЯШЧАЛЬНАЙ ПРАДУКЦЫІ І НЕХАРЧОВАГА ЭТЫЛАВАГА СПІРТУ. ЛІЦЭНЗАВАННЕ ГЭТАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

**Артыкул 5. Права на ажыццяўленне дзейнасці, звязанай з вытворчасцю і абаротам алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту.**

1. У Рэспубліцы Беларусь права на ажыццяўленне вытворчасці, экспарту, імпарту, захоўвання (як віду прадпрымальніцкай дзейнасці) алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту, аптовага і (або) рознічнага гандлю імі маюць толькі юрыдычныя асобы, калі іншае не прадугледжана часткай трэцяй гэтага пункта.

У Рэспубліцы Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, права на ажыццяўленне вытворчасці каньякоў, брэндзі і каньячных напояў маюць толькі дзяржаўныя юрыдычныя асобы або недзяржаўныя юрыдычныя асобы з доляй дзяржавы ў статутным фондзе звыш 30 працэнтаў.

Індывідуальным прадпрымальнікам даецца права на ажыццяўленне ў Рэспубліцы Беларусь:

рознічнага гандлю алкагольнымі напоямі ў аб'ектах грамадскага харчавання;

імпарту і (або) рознічнага гандлю нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыяй, расфасаванай у спажывецкую тару (упакоўку) ёмістасцю не больш за 1 літр (масай не больш за 1 кілаграм).

2. У Рэспубліцы Беларусь за дзяржавай замацоўваецца выключнае права на ажыццяўленне імпарту алкагольнай прадукцыі.

Палажэнне часткі першай гэтага пункта не распаўсюджваецца на алкагольную прадукцыю, якая ўвозіцца на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь арганізатарамі і ўдзельнікамі міжнародных выстаў і кірмашоў у якасці ўзораў і экспанатаў, а таксама для рэалізацыі ў магазінах бяспошліннага гандлю.

Рэалізацыя выключнага права дзяржавы на ажыццяўленне імпарту алкагольнай прадукцыі ажыццяўляецца юрыдычнымі асобамі — пераможцамі конкурсаў на вызначэнне юрыдычных асобаў, якія забяспечваюць рэалізацыю выключнага права дзяржавы на ажыццяўленне імпарту алкагольнай прадукцыі.

Парадак правядзення конкурсаў на вызначэнне юрыдычных асобаў, якія забяспечваюць рэалізацыю выключнага права дзяржавы на ажыццяўленне імпарту алкагольнай прадукцыі, устанаўліваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Імпарт каньячнага, пладовага і этылавага спірту, які атрымліваецца з харчовай сыравіны, састаўных спіртовых паўфабрыкатаў для вытворчасці алкагольных напояў, іншых паўфабрыкатаў з аб'ёмнай доляй этылавага спірту 7 і больш працэнтаў ажыццяўляецца толькі юрыдычнымі асобамі, якія з'яўляюцца перапрацоўшчыкамі алкагольнай прадукцыі.

Імпарт нехарчовага этылавага спірту ажыццяўляецца толькі юрыдычнымі асобамі — перапрацоўшчыкамі ўказанага спірту.

3. Вытворчасць і абарот (за выключэннем экспарту) алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту ажыццяўляецца пры наяўнасці адпаведных спецыяльных дазволаў (ліцэнзій), ліцэнзій на імпарт, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктамі 3 і 4 артыкула 7 гэтага Закона.

Парадак выдачы спецыяльных дазволаў (ліцэнзій), а таксама ўпаўнаважаныя на іх выдачу органы ўстанаўліваюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь з улікам патрабаванняў гэтага Закона.

Ліцэнзіі на імпарт выдаюцца Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб знешнегандлёвай дзейнасці па ўвозе асобных тавараў і з улікам патрабаванняў гэтага Закона.

4. Патрабаванні гэтай главы не распаўсюджваюцца на ліцэнзаванне дзейнасці, звязанай з вытворчасцю і абаротам антысептычных лекавых і ветэрынарных сродкаў, якія адносяцца да нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі, а таксама на вытворчасць арыгінальных алкагольных напояў.

**Артыкул 6. Ліцэнзаванне дзейнасці, звязанай з вытворчасцю алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту**

1. Вытворчасць алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту ажыццяўляецца юрыдычнымі асобамі на падставе спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на дзейнасць, звязаную з вытворчасцю алкагольнай (за выключэннем вытворчасці арыгінальных алкагольных напояў у культурна-этнаграфічных цэнтрах, нацыянальных парках і запаведніках, іншых аб'ектах Рэспублікі Беларусь у мэтах узнаўлення паўнаты беларускіх нацыянальных традыцый), нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі (за выключэннем антысептычных лекавых сродкаў і ветэрынарных сродкаў, якія адносяцца да нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі), нехарчовага этылавага спірту і тытунёвых вырабаў (далей — спецыяльны дазвол (ліцэнзія) на вытворчасць алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту).

2. У спецыяльным дазволе (ліцэнзіі) на вытворчасць алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту ўказваюцца від прадукцыі, што выпускаецца, за выключэннем састаўных спіртовых паўфабрыкатаў, што выробляюцца ў адпаведнасці з тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі ў галіне тэхнічнага нармавання і стандартызацыі і тэхналагічнай дакументацыі і з'яўляюцца неад'емнай часткай тэхналагічнага працэсу атрымання гатовай, прызначанай для рэалізацыі алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту, і іншыя звесткі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб ліцэнзаванні.

**Артыкул 7. Ліцэнзаванне дзейнасці, звязанай з абаротам (за выключэннем экспарту) алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту**

1. Імпарт індывідуальнымі прадпрымальнікамі нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі, расфасаванай у спажывецкую тару (упакоўку) ёмістасцю не больш за 1 літр (масай не больш за 1 кілаграм), а таксама імпарт юрыдычнымі асобамі алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту ажыццяўляецца на падставе ліцэнзій на імпарт.

2. Аптовы гандаль алкагольнымі напоямі, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыяй і нехарчовым этылавым спіртам, захоўванне (як від прадпрымальніцкай дзейнасці) алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту ажыццяўляецца юрыдычнымі асобамі на падставе спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на дзейнасць, звязаную з абаротам (за выключэннем рознічнага гандлю, экспарту і імпарту) алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі (акрамя антысептычных лекавых сродкаў і ветэрынарных сродкаў, якія адносяцца да нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі), нехарчовага этылавага спірту і тытунёвых вырабаў (далей — спецыяльны дазвол (ліцэнзія) на абарот алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту).

3. Юрыдычным асобам, якія ажыццяўляюць вытворчасць алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту на падставе спецыяльных дазволаў (ліцэнзій), даецца права на аптовы гандаль гэтай прадукцыяй і спіртам уласнай вытворчасці без спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на дадзены від дзейнасці, а таксама права на імпарт сыравіны для патрэбаў уласнай вытворчасці без ліцэнзіі на імпарт.

4. Юрыдычныя асобы, якія атрымалі ліцэнзіі на імпарт нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту, могуць ажыццяўляць аптовы гандаль імпартаванымі імі прадукцыяй і спіртам без спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на дадзены від дзейнасці.

5. Рознічны гандаль алкагольнымі напоямі, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыяй ажыццяўляецца юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі на падставе спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на рознічны гандаль (уключаючы алкагольныя напоі і тытунёвыя вырабы) і грамадскае харчаванне (далей — спецыяльны дазвол (ліцэнзія) на рознічны гандаль алкагольнымі напоямі).

**Артыкул 8. Ліцэнзійныя патрабаванні і ўмовы, якія прад'яўляюцца да ажыццяўлення дзейнасці, звязанай з вытворчасцю і абаротам алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту**

1. Спецыяльныя дазволы (ліцэнзіі) на вытворчасць алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту выдаюцца пры наяўнасці ў юрыдычнай асобы на праве ўласнасці, гаспадарчага распараджэння, аператыўнага кіравання адказных патрабаванням артыкулаў 13 і 16 гэтага Закона спецыялізаваных магутнасцяў для выпуску прадукцыі, вытворчасць якой указана ў заяве аб выдачы спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі).

2. Спецыяльныя дазволы (ліцэнзіі) на абарот алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту выдаюцца юрыдычным асобам на падставе наступных патрабаванняў і ўмоў:

памер сфарміраванага статутнага фонду не менш за 100 000 еўра;

наяўнасць на праве ўласнасці, гаспадарчага распараджэння, аператыўнага кіравання складскіх памяшканняў агульнай плошчай не менш за 1000 квадратных метраў;

перыяд ажыццяўлення аптовага гандлю (незалежна ад віду тавару) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь не менш за пяць гадоў.

3. Заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь або прынятымі ў адпаведнасці з імі нарматыўнымі прававымі актамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь могуць быць прадугледжаны дадатковыя ліцэнзійныя патрабаванні і ўмовы, якія прад'яўляюцца да ажыццяўлення дзейнасці, звязанай з вытворчасцю і абаротам алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту.

**Артыкул 9. Дзяржаўны рэестр юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць вытворчасць і абарот алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту**

1. Юрыдычныя асобы, якія ажыццяўляюць вытворчасць, імпарт, захоўванне (як від прадпрымальніцкай дзейнасці) алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту, аптовы і рознічны гандаль гэтай прадукцыяй і спіртам, а таксама індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ажыццяўляюць рознічны гандаль алкагольнымі напоямі ў аб'ектах грамадскага харчавання, імпарт і рознічны гандаль нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыяй, расфасаванай у спажывецкую тару (упакоўку) ёмістасцю не больш за 1 літр (масай не больш за 1 кілаграм), на падставе адпаведных спецыяльных дазволаў (ліцэнзій), ліцэнзій на імпарт, уносяцца ў Дзяржаўны рэестр юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць вытворчасць і абарот алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту (далей — Дзяржаўны рэестр).

2. Дзяржаўны рэестр вядзецца Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь праз уключэнне звестак, якія атрымліваюцца ад інспекцый гэтага Міністэрства па абласцях і г. Мінску, у адзіны банк даных, іх абнаўлення і выключэння.

3. Органы, якія ажыццяўляюць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь выдачу спецыяльных дазволаў (ліцэнзій), ліцэнзій на імпарт (далей — ліцэнзійныя органы) накіроўваюць у інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па месцы іх пастаноўкі на ўлік (далей — інспекцыі МПЗ) звесткі аб юрыдычных асобах і індывідуальных прадпрымальніках, якім выдадзены спецыяльныя дазволы (ліцэнзіі), ліцэнзіі на імпарт, а таксама аб прадаўжэнні тэрмінаў іх дзеяння, выдачы дублікатаў спецыяльных дазволаў (ліцэнзій), ліцэнзій на імпарт, унясенні ў іх змяненняў і (або) дапаўненняў, спыненні, аднаўленні дзеяння, іх ануляванні ў пяцідзённы тэрмін з дня ажыццяўлення ўказаных дзеянняў.

Інспекцыі МПЗ на працягу пяці рабочых дзён пасля атрымання звестак, указаных у частцы першай гэтага пункта, накіроўваюць іх у інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па абласцях і г. Мінску, якія на працягу пяці рабочых дзён пасля атрымання гэтых звестак накіроўваюць іх у Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

4. У звестках аб юрыдычных асобах і індывідуальных прадпрымальніках, якім выдадзены спецыяльныя дазволы (ліцэнзіі), ліцэнзіі на імпарт, указваюцца:

найменне ліцэнзуючага органа, яго ўліковы нумар плацельшчыка;

найменне, юрыдычны адрас юрыдычнай асобы, прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас месца жыхарства індывідуальнага прадпрымальніка, а таксама прысвоены ім уліковы нумар плацельшчыка;

найменне віду дзейнасці, на ажыццяўленне якой выдадзены спецыяльны дазвол (ліцэнзія), ліцэнзія на імпарт;

від прадукцыі пры ўказанні яго ў спецыяльным дазволе (ліцэнзіі), ліцэнзіі на імпарт;

найменне (пры яго наяўнасці), месцазнаходжанне адасобленых падраздзяленняў (філіялаў), гандлёвых аб'ектаў і (або) складскіх памяшканняў з указаннем складнікаў работ і паслуг па кожным з іх;

асаблівыя ўмовы існавання дадзенага віду дзейнасці пры ўказанні іх у спецыяльным дазволе (ліцэнзіі), ліцэнзіі на імпарт;

рэгістрацыйны нумар спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), ліцэнзіі на імпарт і тэрмін іх дзеяння, нумар і дата прыняцця рашэння ліцэнзуючага органа аб выдачы спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), ліцэнзіі на імпарт.

5. Звесткі аб прадаўжэнні тэрмінаў дзеяння спецыяльных дазволаў (ліцэнзій), ліцэнзій на імпарт, выдачы іх дублікатаў, унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у спецыяльныя дазволы (ліцэнзіі), ліцэнзіі на імпарт і (або) дадаткі да іх, спыненні і ўзнаўленні іх дзеяння змяняюць і (або) дапаўняюць звесткі, указаныя ў пункце 4 гэтага артыкула.

6. Выключэнне з Дзяржаўнага рэестра юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў, якім выдадзены спецыяльныя дазволы (ліцэнзіі), ліцэнзіі на імпарт, робіцца:

на падставе звестак ліцэнзійных органаў аб ануляванні ва ўстаноўленым парадку спецыяльных дазволаў (ліцэнзій), ліцэнзій на імпарт;

пасля аднаго месяца з дня заканчэння тэрміну дзеяння спецыяльных дазволаў (ліцэнзій), ліцэнзій на імпарт, калі ад ліцэнзійных органаў не паступілі звесткі аб прадаўжэнні тэрміну іх дзеяння;

у выпадку ліквідацыі юрыдычных асобаў і спынення дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў.

**Артыкул 10. Ануляванне ліцэнзій на імпарт, асаблівасці анулявання спецыяльных дазволаў (ліцэнзій), спынення і прыпынення іх дзеянняў**

1. Ліцэнзіі на імпарт алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту анулююцца або іх дзеянне прыпыняецца Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь у парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб знешнегандлёвай дзейнасці.

2. Асаблівасці анулявання спецыяльных дазволаў (ліцэнзій), спынення і прыпынення іх дзеяння ўстанаўліваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 3
## АБМЕЖАВАННІ Ў ГАЛІНЕ ВЫТВОРЧАСЦІ І АБАРОТУ АЛКАГОЛЬНАЙ, НЕХАРЧОВАЙ СПІРТАЗМЯШЧАЛЬНАЙ ПРАДУКЦЫІ І НЕХАРЧОВАГА ЭТЫЛАВАГА СПІРТУ

**Артыкул 11. Абмежаванні ў галіне вытворчасці і абароту алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту**

1. У Рэспубліцы Беларусь забараняюцца:

1.1. вытворчасць і абарот нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі (за выключэннем антысептычных лекавых і ветэрынарных сродкаў) і нехарчовых прадуктаў з аб'ёмнай доляй этылавага спірту больш за 80 працэнтаў, якія адносяцца да нехарчовага этылавага спірту, без дэнатураваных дабавак і (або) кампанентаў, што змяняюць арганалептычныя ўласцівасці этылавага спірту, адносяцца да алкагольнай прадукцыі, нехарчовага этылавага спірту;

1.2. вытворчасць пладовых вінаў з выкарыстаннем этылавага спірту, які атрымаліваецца з харчовай сыравіны, пладовых вінаматэрыялаў, зброджана-спіртаваных і спіртаваных сокаў замежнай вытворчасці;

1.3. вытворчасць каньякоў, брэндзі і каньячных напояў недзяржаўнымі юрыдычнымі асобамі, якія не маюць долі дзяржавы ў статутным фондзе або з доляй дзяржавы ў статутным фондзе 30 працэнтаў і менш, калі іншае не прадугледжана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

1.4. гандаль састаўнымі спіртовымі паўфабрыкатамі для вытворчасці алкагольных напояў, акрамя рэалізацыі гэтых паўфабрыкатаў юрыдычным асобам, якія маюць права на вытворчасць такіх напояў на падставе адпаведнага спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), а таксама юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам, якія выкарыстоўваюць указаныя паўфабрыкаты для вытворчасці іншай харчовай прадукцыі, калі гэта прадугледжана тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі ў галіне тэхнічнага нармавання і стандартызацыі і тэхналагічнай дакументацыяй;

1.5. пастаўка і перапрацоўка на давальніцкіх умовах сыравіны для вытворчасці алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту;

1.6. увоз фракцыі галаўной этылавага спірту і іншых пабочных прадуктаў спіртовай прамысловасці з утрыманнем этылавага спірту больш за 80 працэнтаў, акрамя ўвозу ўказаных прадуктаў спіртовай прамысловасці юрыдычнымі асобамі, якія маюць спецыяльныя дазволы (ліцэнзіі) на вытворчасць алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту і выкарыстоўваюць гэтыя прадукты для ўласных патрэбаў;

1.7. увоз, перамяшчэнне і (або) захоўванне алкагольных напояў, якія падлягаюць маркіроўцы акцызнымі маркамі і (або) спецыяльнымі маркамі, гандаль гэтымі напоямі без нанесеных акцызных марак і (або) спецыяльных марак, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;

1.8. увоз фізічнымі асобамі больш за 5 літраў (5 кілаграмаў) нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі, нехарчовага этылавага спірту і этылавага спірту, які адносіцца да алкагольнай прадукцыі;

1.9. вытворчасць (выраб), перапрацоўка, захоўванне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, перамяшчэнне па ёй фізічнымі асобамі, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, больш за 5 літраў (5 кілаграмаў) нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі, больш за 5 літраў этылавага спірту, які адносіцца да алкагольнай прадукцыі, больш за 5 літраў нехарчовага этылавага спірту;

1.10. продаж фізічнымі асобамі, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі, нехарчовага этылавага спірту, этылавага спірту, які адносіцца да алкагольнай прадукцыі, і алкагольных напояў, у тым ліку ўласнага вырабу;

1.11. перамяшчэнне па тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, захоўванне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (не для камерцыйных мэтаў) фізічнымі асобамі, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, больш за 5 літраў алкагольных напояў, не маркіраваных ва ўстаноўленым парадку акцызнымі і (або) спецыяльнымі маркамі;

1.12. перамяшчэнне па тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, захоўванне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (не для камерцыйных мэтаў) фізічнымі асобамі, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, больш за 15 літраў алкагольных напояў без дакументаў, якія пацвярджаюць легальнасць іх набыцця, за выключэннем алкагольных напояў, выробленых гэтымі асобамі для ўласнага спажывання;

1.13. аптовы продаж этылавага спірту, які адносіцца да алкагольнай прадукцыі, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных гэтым Законам;

1.14. рознічны гандаль алкагольнымі напоямі:

у дробнарознічнай гандлёвай сетцы, за выключэннем аўталавак (аўтамагазінаў), якія адносяцца да сістэмы спажывецкай кааперацыі, а таксама належаць арганізацыям Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, што ажыццяўляюць рознічны гандаль алкагольнымі напоямі ў сельскай мясцовасці;

у магазінах і павільёнах з гандлёвай залай плошчай менш за 50 квадратных метраў, за выключэннем гандлёвых аб'ектаў юрыдычных асобаў сістэмы спажывецкай кааперацыі, спецыялізаваных (фірменных) магазінаў юрыдычных асобаў, што ажыццяўляюць вытворчасць і (або) імпарт алкагольных напояў, магазінаў бяспошліннага гандлю, размешчаных у сельскай мясцовасці магазінаў арганізацый Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

у будынках (памяшканнях, збудаваннях), дзе размешчаны вытворчыя арганізацыі (за выключэннем спецыялізаваных (фірменных) магазінаў, размешчаных у будынках (памяшканнях) юрыдычных асобаў, якія ажыццяўляюць вытворчасць алкагольных напояў, харчовых магазінаў з гандлёвай залай плошчай 50 і больш квадратных метраў, што маюць адасобленыя ад тэрыторыі вытворчай арганізацыі ўваход для пакупнікоў), і на аб'ектах будаўніцтва;

ва ўстановах адукацыі, арганізацыях аховы здароўя, дзіцячых тэатральна-відовішчных і культурна-асветных установах, інтэрнатах;

у фізкультурна-спартыўных збудаваннях і на іх тэрыторыях, за выключэннем стацыянарных аб'ектаў грамадскага харчавання;

у дыетычных сталовых і дзіцячых кафэ, месцах гандлю, прызначаных для дзяцей і падлеткаў;

у будынках (памяшканнях, збудаваннях), дзе размешчаны дзяржаўныя органы, за выключэннем стацыянарных аб'ектаў грамадскага харчавання;

на аўтазаправачных станцыях, якія не маюць абсталяваных аб'ектаў грамадскага харчавання і (або) харчовых магазінаў з адасобленым уваходам для пакупнікоў;

каля рэлігійна-культавых збудаванняў на адлегласці, якая вызначаецца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі сумесна з рэлігійнымі арганізацыямі;

*(Абзац адзінаццаты не прыводзіцца, паколькі ён не ўступіў у сілу.)**

з выкарыстаннем гандлёвых аўтаматаў, іншых электронных прыбораў;

з прымяненнем інтэрнэт-тэхналогій;

без акцызных марак устаноўленага ўзору і (або) спецыяльных марак (за выключэннем піва з аб'ёмнай доляй этылавага спірту 7 і больш працэнтаў);

без нанесеных на спажывецкую тару (упакоўку) гэтых напояў звестак, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

без дакументаў і (або) маркіроўкі, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь для пацвярджэння адпаведнасці якасці і бяспекі алкагольных напояў устаноўленым патрабаванням;

1.15. рознічны гандаль алкагольнымі напоямі ў разліў, за выключэннем гандлю дадзенымі напоямі ў наступных месцах:

стацыянарных аб'ектах грамадскага харчавання, акрамя аб'ектаў, у якіх гэтым Законам устаноўлена забарона на рознічны гандаль алкагольнымі напоямі;

аб'ектах грамадскага харчавання вытворчых і будаўнічых арганізацый, размешчаных па-за яе тэрыторыяй, іншых аб'ектах грамадскага харчавання пры правядзенні вясельных, юбілейных і іншых урачыстасцяў і рытуальных абрадаў;

цягніках, на рачных і марскіх суднах Рэспублікі Беларусь, дзе маюцца асобна абсталяваныя аб'екты грамадскага харчавання, паветраных суднах, якія выконваюць рэйсы ў замежныя дзяржавы;

спецыяльна абсталяваных вінных магазінах (чарачных або ізаляваных аддзелах);

летніх (сезонных) кафэ, міні-кафэ;

1.16. рознічны гандаль нехарчовым этылавым спіртам;

1.17. бязвыплатная рэалізацыя алкагольных напояў у выпадку:

перадачы алкагольных напояў у якасці аплаты працы работнікаў, у тым ліку ў выглядзе прэмій;

бясплатнага (бязвыплатнага) распаўсюджвання юрыдычнымі асобамі і (або) індывідуальнымі прадпрымальнікамі алкагольных напояў, за выключэннем дэгустацый, што праводзяцца ў маркетынгавых мэтах;

арганізацыі і правядзення конкурсаў, латарэй, гульняў, іншых гульнявых, рэкламных, культурных, адукацыйных і спартыўных мерапрыемстваў, пары ў мэтах стымулявання рэалізацыі алкагольных напояў;

прадастаўлення больш за 5 літраў алкагольных напояў у якасці прызоў (падарункаў) пры правядзенні конкурсаў, латарэй, гульняў, іншых гульнявых, рэкламных, культурных, адукацыйных і спартыўных мерапрыемстваў, пары.

2. Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь могуць быць устаноўлены іншыя абмежаванні на вытворчасць і абарот алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту.

***(Працяг будзе).***


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
**по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности**

***Аукцион состоится 12 сентября 2008 г. в 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.***

***Организатор аукциона:*** фонд «Могилевоблимущество», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 62.

***Продавец недвижимого имущества:*** республиканское унитарное предприятие «Могилевское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру», 212029, г. Могилев, пр-т Пушкинский, 69, тел. 8(0222)453576.

| № лота | Наименование объектов | Местонахождение объектов | Краткая характеристика объектов | Начальная цена продажи объектов, тыс. руб. | Сумма задатка, тыс. руб. | Площадь земельного участка, га. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Изолированное помещение, общей площадью 46,5 кв.м (первый этаж), изолированное помещение общей площадью 36,0 кв.м (второй этаж), изолированное помещение, общей площадью 924,4 кв.м (третий этаж), изолированное помещение, общей площадью 924,8 кв.м (четвертый этаж) | г. Могилев, ул. Вишневецкого, 8а | Изолированные помещения в 4-этажном здании. Фундамент – бетонный, стены – крупнопанельные, перекрытия – железобетонные, полы – бетонные, крыша – совмещенная. | 952 212,5 | 95 000,0 | 0,1828 |

Объекты продаются в собственность без условий.

Имеется решение об отводе земли. Окончательное решение об отводе земли новому собственнику принимается Могилевским горисполкомом.

Задатки перечисляются на расчетный счет № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 536, УНП 700052050 фонда «Могилевоблимущество».

Полная информация об условиях участия в аукционе и порядке его проведения ранее была опубликована в газете «Звязда» 29 июля 2008 г.

Победитель аукциона возмещает фактические затраты на подготовку и проведение аукциона.

Заявки принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к.104. Последний день подачи заявок 10 сентября 2008 г. Заключительная регистрация участников аукциона 12 сентября 2008 г. с 14.00 до 14.50. С объектами можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни с 8 до 17 часов.

**Контактные телефоны: 223375, 311185.**

УНН 700010076

## Памяць пра спаленыя вёскі

**31 жніўня ў вёсцы Боркі Кіраўскага раёна ўрачыста адкрыўся мемарыяльны комплекс у памяць аб спаленых фашыстамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны мірных вёсках Магілёўскай вобласці.**



Фота БЕЛТА.

Вёску Боркі з шасцю навакольнымі пасёлкамі гітлераўцы спалілі 15 чэрвеня 1942 года. Вяскоўцаў расстрэльвалі і палілі жывымі: загінулі 1800 чалавек.

Цяпер там усталяваны 6 мемарыяльных пліт з пералічэннем усіх спаленых у вайну разам з людзьмі населеных пунктаў Магілёўскай вобласці. Іх было больш за сотню. Адны вёскі, як, напрыклад, Боркі, былі адноўленыя пасля вайны, на іншых папялішчах жыццё так і не адрадзілася.

У памяць пра ўсе спаленыя вёскі і ахвяраў вайны ў капліцы ў гонар абраза Божай Маці «Спагнанне загінулых», якая з'яўляецца часткай мемарыяльнага комплексу ў Борках, адбылася памінальная служба.

**Ілона ІВАНОВА.**

Архіўная сенсацыя

# «ЗВАРОТ ТАВАРЫША СТАЛІНА ДА БЕЛАРУСКАГА НАРОДА»

## *Зварот, якога не было*

У канцы 1943 г. і пачатку 1944 г. у многіх партызанскіх брыгадах Віцебскай вобласці і асобных брыгадах Барысаўскай зоны Мінскай вобласці ў газетах і лістоўках друкаваўся «Зварот таварыша Сталіна да беларускага народа». Але 4 красавіка 1944 года ў Мінскі падпольны абкам КП(б)Б з Масквы паступіла радыёграма ад сакратара ЦК КП(б)Б П.К. Панамарэнкі аб неадкладным спыненні друкавання вышэйназванага дакумента, бо ніякага звароту да беларускага народа І.В. Сталін у гэты час не рабіў. Даручалася кіраўніцтву абкама правесці расследаванне па гэтай справе.

У ходзе расследавання было ўстаноўлена, што ўпершыню «Зварот» выйшаў у свет у партызанскай брыгадзе Н.П. Гудкова, якая дыслакавалася ў гэты час у Талачынскім і Крупскім раёнах. У тлумачальнай запісцы камісар 2-га атрада брыгады Н.П. Гудкова М.Д. Караткевіч піша, што ў сярэдзіне лістапада 1943 г., знаходзячыся ў партызанскім шпіталі ў Лепельскім раёне, ён сустрэў двух партызан, якія быццам бы прыбылі з Вялікай Зямлі і перадалі яму тэкст «Звароту».

Пасля вяртання ў сваю брыгаду М.Д. Караткевіч і камісар 5-га атрада І.В. Ільін са згоды камісара брыгады Ф.П. Ігнатовіча на ратататары аддрукавалі 50 экзэмпляраў «Звароту» для распаўсюджвання сярод асабовага складу і насельніцтва. Затым паступова гэты «Зварот» асобным выпускам у форме лістовак і ў газетах атрымаў далейшае распаўсюджванне.

Нарэшце, гэты дакумент дайшоў і да Мінскага падпольнага абкама партыі. 1 студзеня 1944 г. сакратар абкама Р.Н. Мачульскі падпісвае дырэктыву ўсім сакратарам РК КП(б)Б, камісарам брыгад і атрадаў Барысаўскай зоны: «Пры гэтым дасылаю адзін экзэмпляр прынятага па радыё звароту да беларускага народа Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Савецкага Саюза таварыша Сталіна. Прапаную гэты зварот змясціць у чарговых нумарах газет, выпусціць асобнымі лістоўкамі і як мага большым тыражом. Ва ўсіх атрадах і населеных пунктах правесці мітынгі і гутаркі. У населеныя пункты, дзе не ўяўляецца магчымым правесці мітынгі і гутаркі па прычыне блізкасці нямецкіх гарнізонаў, як мага больш закіньце лістовак са зваротам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага... Аб праведзенай рабоце інфармуйце».

Пасля атрымання з Масквы вышэйпамянёнай радыёграмы Р.Н. Мачульскі вымушаны быў экстрана адмяніць сваю дырэктыву ад 1 студзеня 1944 г., бо «высветлілася, што гэты «Зварот» — несапраўдны». І далей у дырэктыве ад 3 красавіка 1944 г. сакратар падпольнага абкама КП(б)Б заклікае: «Надалей быць асцярожным з адказнымі дакументамі і не паддавацца магчымым правакацыям, як гэта мела месца з гэтым «Зваротам» з боку асобных таварышаў, якія падвялі і мяне...».

Хто ж, усё-ткі, з'яўляўся аўтарам сталінскага звароту да беларускага народа?

У дакладной запісцы ад 3 мая 1944 г. на імя сакратара ЦК КП(б)Б П.К. Панамарэнкі ўсё той жа Раман Навумавіч Мачульскі лічыць, што «Зварот таварыша Сталіна да беларускага народа» складзены ў брыгадзе Гудкова камісарам 2-га атрада М.Д. Караткевічам, сумесна з камісарам 5-га атрада В.П. Ільіным з ведама камісара брыгады тав. Ф.П. Ігнатовіча».

Калі гэта сапраўды было справай рук названых камандзіраў, дык незразумела, навошта гэта было патрэбна. Якія наступствы мела гісторыя са «Зваротам»?



(Прочитал и передай другому) Смерть немецким захватчикам!

БОЛЬШЕВИСТСКАЯ ПРАВДА

№ 1 (32) Вторник, 4 января 1944 г. Год издания 3-й.

Газета N-ского партизанского соединения

Честь и слава тому, кто с оружием в руках борется за честь и независимость белорусского народа! (И. СТАЛИН).

Обращение товарища Сталина к белорусскому народу

Братья белоруссы!

В минуту, когда Красная Армия вступила в пределы Белоруссии, в минуту, когда Вы ждете своего освобождения, к Вам обращаюсь я, братья-белоруссы!

[illegible]

Братья белоруссы!

[illegible]

Гордись, белорус, ибо первое звание Героя Советского Союза среди партизан получил белорусс Бумажков. [illegible]

Гордись, белорусс: на знамени твоих доблестных дивизий золотыми буквами написано: „Выше знамя белорусской национальности!"

Пусть эта гордость к Родине превратится в священную ненависть к врагу.

Честь и слава тому, кто с оружием в руках борется за честь и независимость белорусского народа!

Проклятие и позор, и [illegible] смерть тем, кто поднял руку на свободолюбивый белорусский народ.

Мщение и смерть немецким захватчикам!

Верховный Главнокомандующий
Маршал Советского Союза И. СТАЛИН.

Новогоднее выступление Председателя Президиума Верховного Совета СССР тов. М. И. КАЛИНИНА

В день наступления нового года по радио выступил с речью Председатель Президиума Верховного Совета СССР тов. М. И. Калинин.

Ниже печатаем изложение речи товарища Калинина:

Дорогие товарищи! Граждане Советского Союза! Рабочие и работницы! Колхозники и колхозницы! Советская интеллигенция! Бойцы, командиры и политработники Красной Армии и Военно-Морского флота! Партизаны и партизанки! Жители советских районов, временно захваченных немецко-фашистскими оккупантами!

Поздравляю вас с наступающим новым годом.

Товарищи! Третий раз встречает наша страна новый год в условиях жесточайшей борьбы с немецким фашизмом. Все усилия, все помыслы нашего народа связаны с войной, направлены к скорейшему изгнанию врага из пределов Советского Союза, к победе над немецкими захватчиками.

Вполне естественно, что сегодня, в день наступления нового года, каждый советский гражданин задает себе вопрос: что нами сделано за прошедший год и, в первую очередь, на фронте борьбы с немецкими захватчиками? Надо сказать, что сделано много. Конечно, это меньше, чем нами желательно.

Окончание на 2-й стр.

На гэта пытанне дакументы архіва не даюць адказу. Вядома толькі, што камісар 2-га атрада М.Д. Караткевіч неўзабаве загінуў у баі з нямецкімі карнікамі, а В.П. Ільін і Ф.П. Ігнатовіч пасля злучэння брыгады ў чэрвені 1944 г. з часцямі Чырвонай Арміі былі накіраваны ў распараджэнне ЦК КП(б)Б і працавалі пасля вайны на кіруючых пасадах у народнай гаспадарцы рэспублікі.

Відаць, кіраўніцтва рэспублікі палічыла складзены імі «Зварот» патрыятычнай акцыяй і пакінула партызан у спакоі.

**Генадзь БАРКУН,**
**Галоўны архівіст Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.**

Нашчадкі вогненных вёсак

Юльян ЦАЛКО, вёска Круглае Ельскага раёна:

# «У АДЗІН ДЗЕНЬ НЕМЦЫ СПАЛІЛІ З ЛЮДЗЬМІ ДЗВЕ ВЁСКІ — Я БЫЎ СВЕДКАМ ГЭТЫХ ТРАГЕДЫЙ...»

**Наша пастаянная чытачка Кацярына Фёдараўна Цімошчанка з горада Ельска Гомельскай вобласці паведаміла, што ў пасёлку Чырвоны Пільшчык Ельскага раёна пражывае адзін з нашчадкаў вогненных вёсак — Цалко Юльян Аўгуставіч. Ён нарадзіўся ў 1929 годзе ў вёсцы Круглае Ельскага раёна.**



18 чэрвеня 1942 года гітлераўцы спалілі вёску разам з жыхарамі...

«Немцы сагналі ўсіх жыхароў у гумно і падпалілі. Калі гумно пачало гарэць, людзі выламалі вароты і — хто быў яшчэ жывы — стараліся збегчы. Па іх стралялі разрыўнымі кулямі.

Хлопчык прыціскаўся да зямлі і, увесь у крыві і кавалках чалавечага мяса, выпаўз з гумна і пабег у лес, які быў недалёка. Дзякуй богу, ніводная куля яго не дагнала.

...Юльян Аўгуставіч — чалавек сціплы, нешматслоўны, мала каму расказвае пра свой цяжкі лёс».

Кацярына Цімошчанка даслала і нумар тэлефона Юльяна Цалко: «Калі зацікавіцеся, звяжыцеся з ім, ён сам вам усё раскажа».

■ ■ ■

Трагедыя, пра якую напісала ў лісце Кацярына Фёдараўна, аказваецца, адбывалася ў суседняй вёсцы Копанка.

Так атрымалася, што Юльян Цалко быў сведкам трагедыі адразу дзвюх вёсак: роднага Круглага і суседняй Копанкі.

Гэтыя вёскі немцы знішчылі ў адзін дзень — 18 чэрвеня 1942 года.

І абедзве вёскі так і не адрадзіліся пасля вайны — яны на Могілках спаленых вёсак у Хатыні.

■ ■ ■

У вёсцы Копанка жыла бабуля Юльяна — Марыя Дудкоўская. Хлопчык часта наведваў яе, насіў малако. І ў той дзень прыйшоў да бабулі...

Ён апынуўся ў палаючым гумне разам з іншымі капаўчанамі. Цудам уцалеў у тым кашмары, выратаваўся — як і яшчэ некалькі чалавек.

А бабуля згарэла разам з аднавяскоўцамі...

— Я бег прама па забітых людзях, — уздыхае Юльян Аўгуставіч.

Гэта адзін з самых страшных успамінаў яго гаротнага дзяцінства. Хоць у той дзень драматычных эпізодаў, якія назаўжды ўрэзаліся ў памяць, у сэрца, у душу, было столькі, што хапіла б, бадай, на некалькі жыццяў...

■ ■ ■

У вёсцы Копанка Ельскага раёна фашысты знішчылі 62 хаты, загубілі 186 чалавек.

У апошні дзень жыцця Копанкі цудам удалося выратавацца Рэме Вячаславаўне Стахоўскай. Пра лёс гэтай жанчыны «Звязда» расказвала 24 чэрвеня 2006 года. Рэма Стахоўская прыязджала ў Хатынь на сустрэчу нашчадкаў вогненных вёсак разам з дочкамі, зяцямі і ўнукамі.

Я патэлефанавала Рэме Вячаславаўне ў вёску Даманавічы Калінкавіцкага раёна: магчыма, яна памятае Юльяна Цалко?

— На жаль, не. Столькі часу прайшло...

■ ■ ■

... Пасля таго, як Юльяну Цалко ўдалося выпаўзці з вогненнага пекла ў Копанцы, ён стаў прабірацца ў сваю родную вёску Круглае.

І што ўбачыў...

— Я прыйшоў у сваю дзярэўню — яна гарыць, усё дыміць... Ужо згарэўшы людзі былі... І столькі чалавечага мяса было... Я ўбачыў: палка ляжыць якая-та. Той палкай я павярнуў адзін абгарэлы труп — і па плацці пазнаў, што гэта наша суседка..

— Як яе звалі?

— Ганна Хамутоўская. Больш я нікога не кратаў, не чапаў.

У той страшны чэрвеньскі дзень 1942 года разам з аднавяскоўцамі загінула ўся сям'я Юльяна Цалко: бацька Аўгуст Амброзіевіч, маці Цыцылія Валяр'янаўна, сястра Юлія.

Падлетак дабраўся да вёскі Рамязы, дзе жыла яго цётачка Юлія Бейнаровіч.

Яна дала прытулак пляменніку, хоць і сваіх дзяцей было пяцёра.

■ ■ ■

На тым месцы, дзе калісьці было Круглае, дзе стагоддзямі віравала жыццё, — цяпер толькі абеліск.

Да вайны ў Круглым было 12 хат. З 47 жыхароў вёскі загінуў 41.

З фронту вярнуўся жывым толькі адзін ураджэнец Круглага — Цалко Канстанцін Амброзіевіч.

— Гэта родны брат бацькі, мой дзядзька, — расказвае Юльян Аўгуставіч. — Ён вярнуўся, а няма ні роднай вёскі, ні сям'і. Усе загінулі — жонка, дзве дачкі і сын.

... Акурат як у вядомым вершы Міхаіла Ісакоўскага, што стаў песняй:

*Враги сожгли родную хату.*
*Сгубили всю мою семью.*
*Куда ж теперь идти солдату.*
*Кому нести печаль свою?*
<...>
*Стоит солдат —*
*и словно комья*
*Застряли в горле у него.*
*Сказал солдат: «Встречай,*
*Прасковья,*
*Героя-мужа своего...»*
<...>
*Никто солдату не ответил,*
*Никто его не повстречал,*
*И только теплый летний вечер*
*Траву могильную качал.*
<...>
*Хмелел солдат, слеза катилась,*
*Слеза несбывшихся надежд...*

— Франтавік так і застаўся адзін альбо ўсё ж удалося яму нейкім чынам наладзіць асабістае жыццё пасля вайны, стварыць сям'ю? — спытала Юльяна Аўгуставіча.

— Калі забралі ў армію, яму было ўжо 40 гадоў. А пасля вайны — 45... Дый такую трагедыю перажыў чалавек... Ён працаваў вартаўніком у Ельску.

Жыццё так і не склалася. Вайна ўсё перакрэсліла.

■ ■ ■

Пасля службы ў арміі Юльян Аўгуставіч Цалко ўладкаваўся на мэблевую фабрыку пасёлка Чырвоны Пільшчык, дзе адпрацаваў больш як 30 гадоў. Мае шмат узнагарод за выдатную працу, у тым ліку ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Разам з жонкай Марыяй Іванаўнай выхавалі траіх дзяцей, маюць 4 унукаў, 7 праўнукаў.

...Але боль вайны не праходзіць.

**Таццяна ПАДАЛЯК.**

Рэха публікацыі

# РАДАВЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ...

*Ламейка Іван Ільіч, узнагароджаны Георгіеўскім крыжам. Родам ён з вёскі Даманава Даманаўскага сельскага Савета Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Сын селяніна. Іван Ільіч тут жыў і працаваў. Меў 10 дзяцей. Гэта быў паважаны чалавек у вёсцы. Талковы. Ураўнаважаны. Спакойны. Працавіты і ўмелы, як кажуць у народзе. Я яго добра ведаў. З ім можна было цікава пагаварыць. Таксама добра ведаю яго сына Уладзіміра, які жыве ў Мінску. Ён палкоўнік у адстаўцы. Я з ім сустракаўся, ён шмат расказваў пра свайго бацьку і, па маёй просьбе, даслаў мне біяграфію бацькі, Івана Ільіча Ламейкі.*

*Дзед Івана Ільіча, Якім, меў майстэрню, дзе выраблялiся вазы, брычкі, сані, калёсы... На гэта ў яго была ліцэнзія. Ён меў семярых сыноў. Адзін з іх — Ілья, бацька нашага героя. Выраб вазоў і калёсаў перадаваўся ў спадчыну. Паспявалі апрацоўваць сваю зямлю і займацца бізнэсам, як цяпер кажуць.*

*Пачалася Першая сусветная вайна. Беларусаў, якія жылі ў заходняй частцы Беларусі, эвакуявалі, вывезлі ў бежанцы ў Расію. Ілья Ламейка, бацька Івана Ільіча, з сям'ёй таксама выехалі на Усход, у Расію. Затрымаліся каля г. Калуга, дзе памёр яго бацька і быў пахаваны ў вёсцы Перчы.*

*У Расіі пачалася мабілізацыя. Рыхтаваліся да вайны. Івана Ільіча Ламейку прызвалі ў царскую армію. Пасля навучання яго перавялі ў спецыяльны армейскі корпус для адпраўкі на дапамогу Францыі (па яго просьбе). Іх армейскі корпус пагрузілі ў эшалоны і праз усю Расію павезлі ва Уладзівасток. Там перагрузілі на параходы і па паўднёвых марах прывезлі ў Францыю, горад Марсэль. У Францыі салдатаў Расіі (так там звалі іх) адразу накіравалі і кінулі ў бой супраць германскіх войскаў. Салдаты Расіі дапамаглі Францыі адстаяць сваю незалежнасць.*

*У Расіі адбылася Кастрычніцкая рэвалюцыя. Не стала царскай улады. Рускія салдаты, якія ваявалі ў Францыі супраць Германіі, сталі салдатамі неіснуючай дзяржавы. Таму яны сталі палоннымі Францыі. У тым ліку і Іван Ламейка. Там ім прапанавалі службу ў французскім легіёне. Хто адмовіўся служыць, у тым ліку і Іван Ламейка, былі адпраўлены ў Афрыку, у Алжыр, калонію Францыі. Іван Ільіч расказваў, як яны высякалі лазу і на спіне насілі ў пазначанае месца. Займалі людзей працай. Гарачыня там невыносная. Навокал пясок. Цяжкасць нясцерпная была. Але ж трэба было выстаяць, перажыць...*

*І ўсё ж салдатаў вызвалілі з палону праз Чырвоны Крыж. Адправілі іх у горад-порт Адэсу, а там адразу прызвалі ў Рабоча-сялянскую Чырвоную Армію. Іван Ільіч Ламейка ваяваў пад камандаваннем Катоўскага на фронце грамадзянскай вайны.*

*Пасля заканчэння грамадзянскай вайны Іван Ламейка быў дэмабілізаваны. Ён вярнуўся дадому, на бацькаўшчыну, на Беларусь, якая ўжо была пад уладай Польскай дзяржавы. Паўсюль былі бачны сляды вайны. Вёска Даманава спалена. Людзі жылі ў зямлянках.*

*Жыхары вёскі Даманава выбралі Івана Ільіча сваім старастам, як паважанага чалавека, працавітага і свядомага.*

*Ажаніўся Іван Ільіч з Соф'яй Канстанцінаўнай. У іх было дзесяць дзяцей. Іх трэба было карміць, апранаць, вучыць, выхоўваць. Соф'я Канстанцінаўна стала маці-гераіняй, узнагароджана медалём. Па словах сына Івана Ламейкі, Уладзіміра Іванавіча, іх сям'я была запісана на высяленне. Але паколькі Іван Ламейка не займаўся палітыкай, як тады гаварылі, а працаваў на зямлі і ў арцелі, дзе выраблялі калёсы, то «ліха» прайшло міма. У час вайны працаваў на сельскай гаспадарцы.*

*Пасля вайны Іван Ільіч працаваў толькі ў калёснай арцелі. У 1958 годзе памерла жонка Івана Ламейкі. За ім даглядала старэйшая дачка. А ў 1965 годзе ён сышоўся з жанчынай, якая жыла на станцыі Лясная Баранавіцкага раёна. Там і пахаваны.*

*Жыхары вёскі Даманава добра памятаюць Івана Ільіча Ламейку, як добрага бывалага чалавека, аўтарытэтнага, працавітага і сумленнага. Чалавек, які меў свае погляды, паважаў людзей.*

**Вікенцій МАРОЗ,**
*Івацэвіцкі раён.*



*Іван Ільіч ЛАМЕЙКА з сям'ёй (сядзіць).*

Гэты ліст прыйшоў у рэдакцыю ад Вікенція Мароза, жыхара вёскі Даманава, старшыні тамтэйшай ветэранскай арганізацыі. Вікенцій Іванавіч адгукнуўся на прапанову «ЗВЯЗДЫ» пастарацца адшукаць імёны беларусаў-герояў Першай сусветнай вайны і напісаў пра свайго земляка — кавалера Георгіеўскага крыжа, удзельніка Першай сусветнай вайны Івана Ламейку. Так што, калі і вы можаце расказаць пра вашых родных, блізкіх ці землякоў, якія бралі ўдзел у той напаўзабытай вайне, то не саромейцеся, паведамляйце нам у рэдакцыю.

Ну а пакуль паспрабуем трохі праясніць сітуацыю наконт адмаўляць саюзнікам непрыгожа і недыпламатычна, а па-другое, зброі ў Расіі сапраўды не хапала...

Таму шляхам доўгіх перамоў атрымаўся кансенсус: Расія згадзілася падзяліцца з французамі людзьмі, але не неарганізаванай масай, а пяццю брыгадамі прыкладна па 10 тысяч чалавек кожная (фактычна адправіліся толькі 4 брыгады — 1-я і 3-я ў Францыю, 2-я і 4-я ў Салонікі (Грэцыя), да адпраўкі 5-й брыгады справа так і не дайшла), ну а французы ўзброілі гэтых рускіх вайскоўцаў і павялічылі пастаўкі зброі ў Расійскую імперыю.

І вось у лютым 1916 года пачалося фарміраванне ў Маскве і Самары першай асобай пяхот-

# «ЗА ФРАНЦЫЮ!..»

праўкі рускіх салдатаў у Францыю, у тым ліку і Івана Ламейкі. Дык вось, з самага пачатку Першай сусветнай вайны заходнія саюзнікі Англія і Францыя бачылі Расію ў якасці краіны з невычэрпнымі людскімі рэсурсамі, і таму спачатку ў англійскага ўрада ўзніклі думкі аб тым, што Расія можа падзяліцца сваімі салдатамі з саюзнікамі, а потым і ў французскага. Як паказала жыццё, у Англію рускія салдаты так і не патрапілі, а вось на французскай зямельцы некаторым паваяваць давялося...

Французы былі максімалістамі: з-за недахопу ўласных грамадзян яны папрасілі ў Расіі 400 тысяч неарганізаваных салдатаў, а ўзамен абяцалі павялічыць пастаўкі зброі ў Расію ды, вядома ж, атрыманых рускіх салдатаў абмундзіраваць ды ўзброіць. Рускае камандаванне без энтузіязму паставілася да такой прапановы французаў, але, па-першае, ад-

най брыгады, у якую і патрапіў Іван Ламейка. Цікава, што пры адборы вялікую ўвагу надавалі знешняму выгляду — салдаты павінны быць не абы-якімі: іх падбіралі па росце, колеры валасоў і вачэй, каб саюзнікі былі ўражаны вайскоўцамі рускай арміі.

Калі першая брыгада нарэшце была сфарміравана, салдатаў пасадзілі ў вагоны-цяплушкі і праз усю Расію адправілі на Далёкі Усход. Як яно ім ехалася па заснежанай чыгунцы ў невядомую краіну? Напэўна, было трошкі не па сабе, бо хто яго ведае, якая яна, гэтая «Хранцыя»... У горадзе Дальні (або Дайрэн) салдатаў перагрузілі на тры французскія параходы і яны рушылі морам да Францыі. Жоўтае мора, Паўднёва-Кітайскае мора, Сінгапур, востраў Суматра, Індыйскі акіян, Цэйлон, Чырвонае мора, Суэцкі канал, Міжземнае мора — доўгіх 2 месяцы гойдаліся на хвалях рускія салдаты, пакуль нарэшце не прычалілі ў Марсэлі. А там іх ужо сустракалі: з кветкамі, з радасцю, з крыкамі «Vive la Russie!».

Праз некаторы час рускіх салдатаў перавезлі па чыгунцы ў лагер Майі ў Шампані, дзе яны прайшлі навучанне і атрымалі канчатковае абмундзіраванне. Потым сюды ж прыбыла трэцяя асобая пяхотная брыгада, і нашыя салдаты пачалі поплеч з французамі змагацца на фронце: хадзілі ў атакі, адбівалі контратакі, пралівалі кроў на чужой зямельцы... Аднак наступіў 1917 год. З Расіі даходзілі весткі пра рэвалюцыю. Нехта з салдатаў хацеў працягваць ваяваць, а нехта хацеў вярнуцца дадому. Былі створаны салдацкія саветы. Дысцыпліна падала. Таму французы перасталі давяраць рускім брыгадам, баяліся, каб салдацкія саветы не пачалі ўтварацца і ў французскім войску, трымалі рускіх у тыле і думалі — што ж далей рабіць з рускімі салдатамі? Першая асобая пяхотная брыгада мітынгавала ў лагеры Курцін, патрабавала вяртання ў Расію і адмаўлялася выконваць загады, афіцэры і салдаты трэцяй брыгады пакінулі лагер, але ваяваць таксама не вельмі хацелі. Іван Ламейка таксама быў у лагеры Курцін, і ён таксама патрапіў пад артылерыйскі абстрэл, калі «бунтаўшчыкоў» выкурвалі з лагера...

Пасля таго, як лагер Курцін быў узяты, французскі ўрад падзяліў рускіх салдатаў на тры групы: 1) ахвотнікі ваяваць на французскім фронце (амаль усе афіцэры), 2) добраахвотныя працоўныя для адпраўкі ў Паўночную Афрыку, 3) нядобраахвотныя працоўныя ў Паўночную Афрыку. Ці добраахвотна згадзіўся ехаць у Афрыку Іван Ламейка — невядома. Але яго адправілі ў Алжыр. Там ён спачатку тры месяцы быў на каранціне ў горадзе Легуатэ, пасля каля шасці месяцаў працаваў на нейкага французскага фермера, з 1918 года Іван Ільіч разгружаў і загружаў караблі ў порце горада Фалінвіль, а з 1919 года будаваў чыгунку ў Сахары... Ну а ў снежні 1919-га наш герой разам з іншымі былымі салдатамі пры дапамозе Чырвонага Крыжа быў нарэшце накіраваны ў Расію...

Шмат хто не вярнуўся дадому з французскай ды алжырскай зямелькі. Як бачым з ліста Вікенція Мароза, Івану Ламейку пашанцавала — ён вярнуўся-такі на бацькаўшчыну і пражыў доўгае жыццё. Калі пахадзіць па вясковых могілках на чыгуначнай станцыі Лясной, то можна адшукаць і магілу Івана Ламейкі — звычайны помнік, нават без фотакарткі. Так і не скажаш, што тут ляжыць кавалер Георгіеўскага крыжа, якога лёс яшчэ ў пачатку мінулага стагоддзя прымусіў аб'ехаць палову свету, быць параненым у далёкай Францыі, пакутаваць ад спёкі ў Афрыцы, выжыць і вярнуцца сюды, на Беларусь...

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

**многоквартирного жилого дома по улице Волгоградской, 64**
**(крупнопанельный односекционный 10-этажный 40-квартирный жилой дом)**

**Совместное общество с ограниченной ответственностью «БЕЛИНТЕ-РОБА» информирует физических и юридических лиц о создании объекта долевого строительства.**

**Информация о Застройщике.**

ЗАСТРОЙЩИК (Заказчик) – СООО «БЕЛИНТЕ-РОБА».

Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 31 марта 2004 года № 653 в Едином государственном регистре юридических и индивидуальных предпринимателей за № 190527399.

Адрес Застройщика: 220103, г. Минск, ул. Калиновского, 77а, ком. 304, телефон/факс: 281 41 15, 281 21 98.

Режим работы: понедельник – пятница: с 8.30 до 17.30, выходные дни: суббота, воскресенье, обед: 13.30–14.30.

В течение предыдущих трех лет организацией строительство не осуществлялось.

**Информация о проекте.**

Цель строительства – исполнение инвестиционного проекта по договору о реализации права проектирования и строительства объекта *«Многоквартирного жилого дома по ул. Волгоградская, 64 в г. Минске»* от 27 августа 2008 г. с Минским городским исполнительным комитетом.

Объект долевого строительства — многоквартирный 10-этажный крупнопанельный жилой дом (односекционный 40-квартирный жилой дом, не относящийся к домам повышенной комфортности) серии М111-90.БС40, с подвалом, техническими помещениями, чердаком, высота жилых этажей – 2,6 метра. Фундаменты – ленточные сплошные из сборных железобетонных плит серии Б1.012.-1-1-99 и бетонных блоков серии Б1.016.1-1. Категория комфортности по шуму – «В». Потолки – железобетонные панели. Стены и перегородки – железобетонные панели, а также из кирпича и ячеистых блоков. Полы – подготовка без покрытия (железобетонная стяжка). Вентиляция жилых помещений – естественная. Отопление, электричество, водоснабжение, канализация, газ – городские сети с индивидуальными приборами учета.

Расположен в Первомайском районе в г. Минске на пересечении ул. Волгоградская – ул. Кнорина. Характеристики прилегающей территории: *юг* – ул. Волгоградская и среднеэтажная жилая застройка; *запад, север* – проектируемая многоквартирная жилая застройка; *восток* – ул. Кнорина и индивидуальная жилая застройка.

Секция оснащена лифтом грузоподъемностью 400 кг и мусоропроводом.

Наружная отделка – покраска красками. На цоколе и фасадах нежилой части здания – цокольные панели с атмосфероустойчивой отделкой под покраску.

Общая площадь здания – 3 099,16 кв.м. Жилая часть общей площадью квартир – 2 796,73 кв.м, стоимостью в базисных ценах 1991 г. – 1710,702 тыс. руб. располагается с 1 (первого) этажа.

Всего квартир – 40 (сорок) квартир.

Согласно Указа Президента Республики Беларусь от 31 января 2008 года № 55, для привлечения физических лиц к строительству по договорам создания объекта долевого строительства предлагается 10 (десять) квартир по стоимости затрат на строительство по состоянию на 02.09.2008 г.

- двухкомнатные – максимальной общей площадью 58,27 кв.м стоимостью 4 300 000 (четыре миллиона триста тысяч) белорусских рублей за 1 кв.м – шесть квартир;

- трехкомнатные – максимальной общей площадью 82,27 кв.м стоимостью 4 300 000 (четыре миллиона триста тысяч) белорусских рублей за 1 кв.м – четыре квартиры;

Отделка квартир не выполняется.

Все квартиры – имеют летние помещения (лоджии).

В жилых помещениях, расположенных со стороны лицевых фасадов со стороны улицы Волгоградская, оконные блоки приняты шумо-защитной конструкции.

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические помещения и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков.

Элементы благоустройства:

- на цоколе и фасадах нежилой части здания – атмосфероустойчивая отделка под покраску;

- на фасадах – освещение (подсветка) фасадов, выходящих на улицы Волгоградская и Кнорина;

- благоустройство включает дворовую территорию с расположением детской, бельевой и хозяйственной площадок; озеленение территории, предусмотрено устройство тротуаров, дорожек;

- автостоянка на 25 машиномест.

Вышеприведенные характеристики подтверждены решением РУП «БЕЛГОСЭКСПЕРТИЗА МИНСТРОЙАРХИТЕКТУРЫ» от 30.05.2008 года № 0375-8-2008.

**Застройщиком получены:**

**- акт о выборе места размещения земельного участка на 0,25 га, утвержденного 28 июня 2008 года Председателем Минского городского исполнительного комитета;**

**- разрешение на строительство Минского городского исполнительного комитета от 11 июля 2008 года № 1508 (I);**

**- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права постоянного пользования на него от 18 августа 2005 г. № 500/306-421;**

**- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права временного пользования на него от 28 апреля 2008 г. № 500/986-60;**

**- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу, заключение РУП «БЕЛГОСЭКСПЕРТИЗА МИНСТРОЙАРХИТЕКТУРЫ» от 29.08.2008 года № 0827-8-2008;**

**- государственная экологическая экспертиза объекта проведена в составе проекта «Строительство многоквартирного жилого дома неповышенной комфортности по ул.Волгоградской, 64 в г. Минске» Минприроды РБ – заключение от 07.08.2008 г. № 02-11/516;**

**- договор строительного подряда № 136 от 02.05.2008 г. с ОАО «МАПИД»;**

**- выданное органом государственного строительного надзора разрешение на организацию стройплощадки от 08.05.2008 г. № 2-206Ж-029/08;**

**- выданное органом государственного строительного надзора разрешение на производство строительно-монтажных работ от 07.08.2008 г. № 2-206Ж-029/08.**

Срок окончания строительства – 1 (первый) квартал 2009 года.

Уполномоченный риэлтер – ОДО «Твоя столица-консалт».

УНП 190527399

Спорт-тайм

### ДЫНАМАЎЦЫ ДЭБЮТУЮЦЬ У КХЛ

Сёння беларусы стартуюць у Кантынентальнай хакейнай лізе. Мінскае «Дынама» дэбютуе ў адкрытым чэмпіянаце Расіі ў гасцях у новакузнецкага «Металурга». Нягледзячы на серыю паражэнняў у перадсезонных спарынгах галоўны трэнер «бела-блакітных» Джым Х'юз перакананы, што каманда рухаецца ў правільным накірунку і будзе змагацца ў кожным матчы.

### ТРАКТАРАЗАВОДЦЫ ПАЦЯСНІЛІ БАТЭ

Выступленне футбалістаў БАТЭ ў кваліфікацыі Лігі чэмпіёнаў не магло не паўплываць на гульню барысаўчан у нацыянальным першынстве. Стомленыя ад напружаных паядынкаў гульцы Віктара Ганчарэнкі ў чацвёрты раз не змаглі разжыцца перамогай у вышэйшай лізе. Дамінаваўшы з лікам 2:0 у процістаянні са «Смаргонню», БАТЭ разжыўся чарговай нічыёй — 2:2. Як вынік — страта лідарскай пазіцыі. Пасля 21-га тура верхні радок занялі мінскія трактаразаводцы, якія выйгралі ў магілёўскага «Дняпра» — 3:1. Праўда, БАТЭ яшчэ мае матч у запасе, ды і яго адставанне ад МТЗ-РІПА мінімальнае, таму сітуацыя можа змяніцца. І ўсё ж выступленне на двух франтах, Лізе чэмпіёнаў (з 17 верасня) і першынстве краіны, можа стаць для барысаўчан той перашкодай, якая не дазволіць зноў стаць наймацнейшым клубам Беларусі. На трэцюю пазіцыю перабраўся салігорскі «Шахцёр», які разграміў наваполацкі «Нафтан» — 3:0. Вынікі іншых сустрэч 21-га тура: «Віцебск» — «Гомель» — 1:1, «Дынама» (Мінск) — «Дарыда» (Ждановічы) — 2:2, «Дынама» (Брэст) — «Тарпеда» (Жодзіна) — 2:0, «Лакаматыў» (Мінск) — «Нёман» (Гродна) — 0:4, «Савіт» (Магілёў) — «Граніт» (Мікашэвічы) — 0:0.

Становішча камандаў: МТЗ-РІПА — 45 ачкоў, БАТЭ — 44, «Шахцёр» — 39, «Дынама» (Бр), «Дынама» (Мн) — па 37, «Віцебск» — 35, «Нафтан» — 31, «Днепр» — 30, «Граніт» — 26, «Смаргонь» — 24, «Тарпеда» — 22, «Нёман» — 21, «Гомель» — 20, «Савіт» — 17, «Лакаматыў» — 16, «Дарыда» — 10.

Цяпер у чэмпіянаце да 14 верасня перапынак, звязаны з матчамі нацыянальнай і маладзёжнай зборных. 6 верасня ў Львове падапечныя Бернда Штанге стартуюць у адборачным турніры да ЧС-2010 супраць каманды Украіны (10 верасня адбудзецца матч супраць Андоры). У нашай «маладзёжкі» наадварот заключная гульня: 9 верасня беларусы выйдуць на поле ў кваліфікацыйным матчы да Еўра-2009 у гасцях з латвійскімі футбалістамі.

### СУПЕРКУБАК У «ЗЕНІТА»

Сапернік барысаўскага БАТЭ ў Лізе чэмпіёнаў па групе Н, піцерскі «Зеніт», днямі папоўніў сваю калекцыю трафеяў. Расійскі клуб выйграў у Манака Суперкубак Еўропы. Пераможцы Лігі чэмпіёнаў, футбалісты «Манчэстэр Юнайтэд», уступілі нашым усходнім суседзям, уладальнікам Кубка УЕФА, з лікам 1:2. У складзе расіян вызначыліся Паграбняк і Дані, сярод англічан — Відзіч.



### РАМАШЧАНКА ПАДАЎ У АДСТАЎКУ

Экс-футбаліст зборнай Беларусі па футболе Міраслаў Рамашчанка падаў у адстаўку з пасады галоўнага трэнера ФК «Том», які ўзначаліў у чэрвені гэтага года. Такое рашэнне настаўнік прыняў з-за буйнога пройгрышу тамічоў (0:4) у матчы расійскай прэм'ер-лігі супраць самарскіх «Крылаў Саветаў».

### ВАЛУЕЎ ВЯРНУЎ САБЕ ПОЯС

У 12-раўндавым паядынку расійскі баксёр-цяжкавагавік Мікалай Валуеў справіўся з амерыканцам Джоні Руісам і стаў чэмпіёнам свету па версіі WBA (Сусветная баксёрская асацыяцыя). Такім чынам, майстар скураной пальчаткі вярнуў сабе тытул, які згубіў у красавіку мінулага года з-за моцнага Руслана Чагаева.



# ШКОЛЬНЫЯ ВЕДЫ МАЮЦЬ СВОЙ «КОШТ»

**Міністэрствам адукацыі зацверджаны памер платы за карыстанне школьнымі падручнікамі ў 2008/2009 навучальным годзе. Як і ў папярэднія гады, бацькі будуць аплачваць толькі 50 працэнтаў кошту падручнікаў.**

Для першакласнікаў карыстанне камплектам падручнікаў будзе каштаваць 9920 рублёў. Для вучняў 2-х класаў — 11 170 рублёў, для 3-х класаў — 8010 рублёў, для 4-х — 9060 рублёў, для 5-х — 7920 рублёў, для 6-х — 10 590 рублёў, 7-х — 16 130 рублёў, 8-х — 19 910 рублёў, 9-х — 22 940 рублёў, 9-га (штрых) — 22 360 рублёў, 11-х — 13 660 і 11-х (штрых) 16 890 рублёў.

У адпаведнасці з рашэннем Урада, ад унясення платы за карыстанне падручнікамі вызваляюцца: выхаванцы спецыяльных устаноў адукацыі (спецыяльных дашкольных устаноў, спецыяльных агульнаадукацыйных школ, спецыяльных агульнаадукацыйных школ-інтэрнатаў, цэнтраў карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі), спецыяльных школ закрытага тыпу; навучэнцы санаторных школ-інтэрнатаў; бацькі, дзеці якіх маюць асаблівасці псіхафізічнага развіцця; сем'і, у якіх адзін ці абодва бацькі — інваліды I ці II групы; сем'і, якія ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» атрымліваюць дзяржаўныя дапамогі на дзяцей ва ўзросце да трох гадоў; сем'і рабочых і служачых, якія займалі штатныя пасады ў вайсковых часцях у складзе савецкіх войскаў, загінулых, памерлых ці стаўшых інвалідамі пры выкананні службовых абавязкаў; сем'і ваеннаслужачых радавога і кіруючага складу органаў унутраных спраў, падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, органаў фінансавых расследаванняў КДБ, якія загінулі ці сталі інвалідамі ў перыяд нясення службы.




Фота Пятра ФАМІНА.

Не бярэцца плата за карыстанне падручнікамі таксама з дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў і інвалідаў з дзяцінства. Для бацькоў, якія выхоўваюць траіх і больш дзяцей, плата за школьныя падручнікі змяншаецца на 50 працэнтаў ад зацверджаных лічбаў.

Плата за карыстанне вучэбнай літаратурай уносіцца да 1 кастрычніка ў мясцовыя аддзяленні «Беларусбанка».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ВЁСКА МАЯ, ПРЫГАЖУНЯ

Гэтыя фотаздымкі зроблены ў адной з самых вялікіх гаспадарак Петрыкаўскага раёна КСУП «Чалюшчавічы». Яе працаўнікі вядомыя сваімі поспехамі — тут атрымліваюць высокія ўраджаі, добрыя надоі, але акрамя названага мясцовыя гаспадары з гонарам могуць паказваць гасцям свае падворкі — дагледжаныя, заможныя. Вёска расце: вуліца новых будынкаў упрыгожыла ўскраіну.





Юля і Дыяна Панцюк прыехалі сюды ў госці да бабулі і ахвотна бавяць час на вуліцах вёскі. Саша Шурпач заве сябе мясцовым, відаць, таму яму найбольш падабаюцца на вясковай вуліцы вось гэтыя палескія баравікі, складзеныя з камення і па-мастацку расфарбаваныя.

**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

Фестывалім

# «5 ЗОРАК» ПАЕДУЦЬ У ДУШАНБЕ

**Міжнародны конкурс маладых выканаўцаў «5 зорак. Інтэрбачанне», які завяршыўся ў нядзелю ў Сочы, выйграла маладая спявачка з Таджыкістана Тахміна Ніязава. Па выніках галасавання гледачоў яна абышла яўных фаварытаў — гурт «Кватра» з Расіі — усяго на 1 бал. Паводле правілаў, наступны конкурс вакалістаў налета пройдзе ў Таджыкістане. Прычым арганізатары не выключаюць, што да ўдзелу ў песенным спаборніцтве будзе запрошана большая колькасць выканаўцаў, і не толькі з краін — удзельніц СНД.**

Нагадаем, сёлета конкурс «5 зорак» праходзіў у чацвёрты раз і сабраў прадстаўнікоў 11 краін: Расіі, Беларусі, Украіны, Малдовы, Латвіі, Арменіі, Азербайджана, Казахстана, Кіргізіі, Таджыкістана і Туркменістана. Кожная краіна выставіла па адным удзельніку, а таксама па адным прадстаўніку ў журы. На працягу некалькіх конкурсных дзён удзельнікі выконвалі арыгінальныя песні, рэтра-хіты, а таксама сусветныя хіты. Увесь гэты час ішло глядацкае галасаванне, якое і вызначала ў рэшце рэшт, каму дастанецца Гран-пры.



Па суме балаў (216) перамогу атрымала 19-гадовая Тахміна Ніязава. Першую прэмію заваявалі расійскі гурт «Кватра» і спявак з Арменіі Размік Амян. Другую прэмію падзялілі прадстаўніца Латвіі Амбер, канкурсант з Казахстана Алмас і гурт з Украіны «Небяспечныя сувязі». На трэцім месцы апынуліся адразу тры канкурсанты — беларускі гурт «The Champions», малдаванін Барыс Коваль і артыстка з Туркменіі Лачын Мамедава. А калі ўзгадаць яшчэ пра спецыяльны прыз Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва краін — удзельніц СНД (прыз гэты дастаўся спеваку Сейрану з Азербайджана), то практычна ніводны канкурсант не застаўся без узнагароды. Наадварот, камусьці і па дзве дасталіся.

Для ўдзельніцы з Кіргізіі Гулзінат Суранчыевай, якой не хапіла «афіцыйных» прызоў, знайшлася ўзнагарода ад адміністрацыі горада Сочы. Акрэдытаваная на «Інтэрбачанні» прэса свае сімпатыі і прыз аддала гурту «Кватра». Акрамя Гран-пры, павезла дадому ў Туркменістан прыз «Дэбют Інтэрбачання» Тахмін Ніязава — самая маладая з удзельнікаў. «Міс Інтэрбачанне» невядома па якіх крытэрыях стала туркменка Лачын Мамедава, затое спецпрыз «За стыльнасць» быў уручаны латышцы Амбер. Шляхам простых падлікаў атрымліваем: на 11 канкурсантаў прыпала 15 розных узнагарод, так што крыўды сярод удзельнікаў як быццам быць не павінна. А вось ці выйграюць ад запальвання новых «зорак» гледачы — пытанне пакуль што рытарычнае.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**Фота з афіцыйнага сайта конкурсу www.5stars.ru.**

## Як зловіш рыбу — адпусці яе

Якіх бы памераў і вагі яна ні была: хоць на пяцьдзясят грамаў ёршык ці на два пуды сом. Усё роўна — у ваду іх. Такімі былі ўмовы трэціх адкрытых асабіста-камандных спаборніцтваў першага чэмпіянату Беларусі па спартыўнай лоўлі на фідар, у якіх узялі ўдзел таксама спартсмены-рыбаловы з Украіны. Яны праходзілі ў Гомелі на набярэжнай Сожа, каля самага цэнтра горада, што выклікала ў каго-нікаго з рыбаловаў скептычны настрой: знайшлі, маўляў, месца. Вось калі б, напрыклад, на Браслаўшчыне ці на Нарачы, зусім іншы марафет быў бы. А тут што: можа, толькі пячкура задрыпанага ўпалюеш.

Але, як кажуць, слабаму рыбалову і фідар перашкаджае, а моцнаму спрыяе ўдача. Гэта, у прыватнасці, даказаў гамяльчанін Андрэй Гардзіенка, які за пяць гадзін злавіў ляшча і язя па паўтара кілаграма кожны і ў якога на фінішы было ў сачку 4562 грамы рыбы. Гэта ўсяго на 322 грамы менш, чым у «Аматара» з Магілёва, якая, як і Андрэй, заняла першае месца. Толькі ў камандным заліку. Ёсць у Сожы рыба, ёсць!

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## Закурыў

На выгане каля в. Клепічы Пружанскага раёна ў перасоўным вагоне, які належаў ААТ «Жураўлінае», здарыўся пажар.

Калі агонь затушылі, то ў вагоне знайшлі мёртвага пастуха.

Пажар, верагодна, узнік ад таго, што 35-гадовы мужчына закурыў у пасцелі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Інфарм-укол

# Даследаванні для жанчын «залатога» ўзросту

**Медыкі раяць усім жанчынам, каму ад 40 і болей гадоў, сачыць за сваім здароўем з дапамогай некалькіх даследаванняў.**

**Праверка ліпідаў.** Дазваляе вызначыць узровень халестэрыну ў крыві, які назапашваецца ў сценках сасудаў у выглядзе бляшак. Пры разрыве бляшкі ўтвараецца тромб, які перакрывае сасуд, што і прыводзіць да інфарктаў і інсультаў. Сучасныя прэпараты і метады лячэння могуць палепшыць ліпідны профіль і знізіць рызыку ўзнікнення такіх праблем.

Рабіць штогод. Нашча здаваць кроў з вены ў любой лабараторыі. Калі вы курыце або ў вас дрэнная спадчыннасць (інфаркт быў у некага з блізкіх), то лепш, каб вынік аналізаў патлумачыў урач. Пры наяўнасці праблем варта рабіць тамаграфію каранарных артэрый.

**Праверка цукру.** Дазваляе выявіць цукровы дыябет другога тыпу, які найчасцей узнікае ў асобаў з лішняй вагой.

Рабіць раз у тры гады. Пры атлусценні — штогод. Трэба здаць кроў з вены нашча ў любой лабараторыі.

**Даследаванне кішэчніка.** Эндаскапічнае даследаванне кішэчніка на адсутнасць раку тоўстай і прамой кішкі — фібракаланаскапія дазваляе выявіць пухліны на ранніх стадыях. У ЗША гэта даследаванне, якое праводзіцца практычна ўсім грамадзянам пасля 50 гадоў, а таксама рэгулярныя даследаванні стану сэрца і сасудаў дазволілі працягнуць жыццё амерыканцам у сярэднім да 80 гадоў.

Пры выяўленні паліпаў, пухлін іх выдаляюць з дапамогай эндаскапічнай хірургіі.

Рабіць пасля 50 гадоў адзін раз у 5 гадоў. Даследаванне праводзіцца амбулаторна, пасля папярэдняй падрыхтоўкі, пад лёгкім наркозам, без непрыемных адчуванняў. Гэта можна зрабіць у профільных або платных клініках буйных гарадоў.

**Візіт да гінеколага.** З мэтай абследавання шыйкі маткі, цыталагічнага даследавання і аналізу на вірус папіломы чалавека.

У 45—50 гадоў пры згасанні функцыі яечнікаў нярэдка ўзнікаюць парушэнні сну, з'яўляецца пастаянная стомленасць, патлівасць, раздражняльнасць, агрэсіўнасць, плаксівасць. Перыядычна ўзнімаецца ціск, пагаршаецца стан валасоў, скуры, слізістых. Пры гэтых сімптомах трэба абавязкова пайсці да гінеколага. Урач можа прызначыць даследаванне крыві на гармоны і па паказаннях (агульных рэкамендацый тут быць не можа) — замяшчальную гарманальную тэрапію. Трэба разумець, што стан сасудаў, скуры, знешні выгляд напрамую залежаць ад колькасці эстрагенаў. Можа быць паказана і гамеапатычнае лячэнне.

Абследавацца ў гінеколага неабходна раз у год з пачатку палавога жыцця. Пасля 45—50 гадоў пры парушэннях рытму месячных — часцей. Лепш за ўсё звяртацца да таго ўрача, якому давяраеце.

**Даследаванне малочных залоз.** Рак малочнай залозы — адно з самых частых анкалагічных захворванняў у жанчын. Узнікае нечакана, без папярэдніх скаргаў. Калі рак выяўлены на ранніх стадыях, ён пасяхова лечыцца.

У рэпрадуктыўным узросце варта рабіць ультрагукавое даследаванне малочных залоз раз у год. Пасля 45 гадоў — ультрагук або мамаграфію раз у год па рэкамендацыі гінеколага або мамолага. Робіцца ў многіх бясплатных і платных клініках.

**Вызначэнне шчыльнасці касцей.** Гэты від абследавання называецца дэнсітаметрыяй. Дазваляе пазбегнуць астэапарозу (разбурэння коснай тканкі), які ўзнікае ў выніку дэфіцыту эстрагенаў і прыводзіць да пераломаў. У групе рызыкі — бландзінкі з вузкімі касцямі. Умацоўваюць косці фізічныя нагрузкі і малочная дыета. Лечаць астэапароз з дапамогай лекавых прэпаратаў.

Рабіць у пачатку менапаўзы. Рэкамендацыю вызначыць стан касцей звычайна дае гінеколаг, тэрапеўт або эндакрынолаг. Давядзецца прайсці простую амбулаторную маніпуляцыю з дапамогай апарата дэнсітометра. Можна зрабіць у многіх профільных або платных клініках буйных гарадоў.

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.**

# 10 САМЫХ ЖУДАСНЫХ МЕСЦАЎ НА СВЕЦЕ

### 8. ТУПІК МЭРЫ КІНГ У ЭДЫНБУРГУ



Некалькі вуліц са змрочным мінулым, утоеных пад сярэднявечным Старым горадам у Эдынбургу. Месца, дзе зачынялі і пакідалі паміраць ахвяраў чумы ў XVII стагоддзі, славіцца палтэргейстам. Турыстаў тут кратае за рукі і за ногі нешта нябачнае. Лічыцца, што гэта здань Эні, маладзенькай дзяўчыны, якую яе бацькі пакінулі там у 1645 годзе. Праз сто гадоў, тэрмін, які так любяць у страшных казках, на месцы тупіку Мэры Кінг пабудавалі вялікі новы будынак. У 2003 годзе тупік адкрылі для турыстаў, якіх прыцягвалі байкі аб яго звышнатуральнай парфуме. Экскурсантаў правядуць уніз па каменных прыступках у цесныя прыгнятальныя завулкі. Галоўнае — не спыняцца, асабліва калі адчуваеш ледзяны павеў смерці.

### 9. ТЭЛЕМСКАЕ АБАЦТВА НА СІЦЫЛІІ

Алістар Кроўлі, мабыць, адзін з агіднейшых акультыстаў у свеце, і гэты каменны фермерскі дом, набіты змрочнымі паганскімі фрэскамі, калісьці быў сусветнай сталіцай сатанінскіх оргій. Прынамсі, так лічылі ў 20-х гадах мінулага стагоддзя.

Кроўлі вядомы ў асноўным сваімі прыхільнікамі тыпу Мэрыліна Мэнсана і тым фактам, што з'явіўся на вокладцы альбома «Бітлз» Sgt. Pepper's Lonely Hearts Club Band. Кроўлі заснаваў Абацтва Тэлема, названае ў гонар утопіі, апісанай у «Гарганцюа» Рабле, дэвізам якой было «Рабі, што хочаш». Яно стала камунай вольнага кахання. Пачаткоўцаў прымушалі праводзіць ноч у «Пакоі кашмараў», дзе, напампаваўшыся гераінам і марыхуанай, яны вытарэшчваліся на фрэскі зямлі, нябёсаў і пекла. Пасля таго як у абацтве памёр папулярны англійскі дэндзі, прэса ўчыніла скандал і вымусіла Мусаліні прычыніць шарашку. Сумна вядомы падпольны рэжысёр Кенет Энджар у 1945 годзе раскапаў гэтую



гісторыю і зняў там фільм, які пасля загадкава знік. Цяпер абацтва паўразбуранае і зарасло травой. Але ў сярэдзіне захавалася некалькі фрэсак, якімі Кроўлі палохаў паслядоўнікаў. Турысты, схільныя да эзатэрыкі, могуць пабадзяцца і паказытаць там сабе нервы.

### 10. ЧАРНОБЫЛЬ ВА УКРАІНЕ

Ва Украіне, прыехаўшы ў пакінуты горад Прыпяць, турысты трапляюць у зону адчужэння. Тут усе рэчы кінутыя ў спешцы і пакінутыя з таго самога жудаснага 1986 года,



калі аварыя на Чарнобыльскай АЭС прымусіла дзясяткі тысяч людзей назаўжды пакінуць свае дамы. Наросхрыст расчыненыя кватэры, у дзіцячых садках уецца па размаляваных сценах плюшч, валяюцца раскінутыя цацкі, на кухонных сталах засталіся ляжаць недачытаныя газеты. Арэлі, усё гэтак жа рыпаючы, разгойдваюцца ў двары пад парывамі ветру. Цяпер, калі ўзровень радыяцыі панізіўся да бяспечнага на час кароткатэрміновага візіту, Чарнобыльскую зону адкрылі для турыстаў. Экскурсіі ў Чарнобыль практычна аднолькавыя, паколькі перасоўванні ў зоне адчужэння моцна абмежаваныя. Як правіла, турысты выязджаюць з Кіева на аўтобусе, затым пешшу ідуць да ЧАЭС, праходзяць па ёй экскурсіяй, глядзяць на «Саркафаг». Можна пабадзяцца па вуліцах горада-здані Прыпяці і наведаць стаянкі заражаных транспартных сродкаў. А таксама сустрэцца з мясцовымі самасёламі, жыхарамі «забароненай зоны».

Заканчэнне. Пачатак у нумары за 30 жніўня.

Zамор'е

## Злоўлены мегавелазлодзей



Канадская паліцыя сцвярджае, што злавіла самага буйнога злодзея веласіпедаў у свеце. Афіцыйныя асобы знайшлі 2865 выкрадзеных веласіпедаў у гаспадара веламагазіна ў Таронта. 49-гадовы Ігар Кенк, які пакутуе ад такой арыгінальнай формай клептаманіі, чакае суда па 58 абвінавачваннях у крадзяжы. Таксама суд абвінавачвае яго ў тым, што ён захоўваў у сябе выкрадзеныя тавары і прылады, з дапамогай якіх здзяйсняў злачынствы.

У памяшканні магазіна было настолькі шмат веласіпедаў, што пажарнай службе давялося на вяроўках выцягваць крадзены тавар праз верхняе акно. 200 веласіпедаў паліцыя знайшла ў хаце Кенка разам з вялікай колькасцю наркотыкаў. Таксама дзесяць домаўладальнікаў расказалі, што здавалі злачынцу ў найм гаражы, кожны з якіх таксама быў забіты веласіпедамі.

Паліцыі Таронта давялося працаваць пад прычынай, каб вылічыць злодзея. Ён быў арыштаваны пасля таго, як следчыя, заўважыўшы адзін яго буйны пракол у чэрвені, паставілі ў якасці прынады мноства веласіпедаў на вуліцах горада. Каля 15 тыс. чалавек наведалі гараж пры ўчастку, куды была перамешчаная калекцыя Кента. Ужо 500 чалавек змаглі знайсці там сваіх «жалезных коней».

## Сэкс... у інтарэсах следства



Агенты паліцыі пад прыкрыццем сцвярджаюць: па абавязку службы ім давялося займацца сэксам з прастытуткамі.

Увесну гэтага года Кіт Брэйнер і Дэвід Кікер увайшлі ў групу па расследаванні дзейнасці спа-салонаў у горадзе Бамонт, штат Тэхас. Праваахоўныя органы падазравалі, што ў салонах насамрэч аказваюцца паслугі сэксуальнага характару. Агенты працавалі пад прыкрыццем: стаўшы пастаяннымі кліентамі спа, яны спрабавалі сабраць доказы існавання сеткі падпольных публічных дамоў. Аднак у канцы ліпеня абодва паліцэйскія былі адхіленыя ад выканання службовых абавязкаў без захавання грашовага ўтрымання. Справа ў тым, што іх калегі выявілі: агенты самі карысталіся паслугамі прастытутак. Брэйнер і Кікер, застаўшыся без працы і сродкаў да існавання, звярнуліся ў суд з патрабаваннем аднавіць іх на пасадах і пакрыць грашовае ўтрыманне за апошнія пару месяцаў. Агенты прызналіся, што сапраўды сышліся з указанымі прастытуткамі, але заявілі, што рабілі гэта выключна паводле загаду начальства. Начальнік паліцыі горада Бамонта Фрэнк Кафін праходзіць па справе ў якасці сведкі, і яго паказанні супярэчаць паказанням падначаленых.

## «Мірны» трактар



Ізраільская абаронная кампанія «Міфрам», якая спецыялізуецца на сталёвых і браняваных канструкцыях, прадставіла сваю новую распрацоўку — браніраваны трактар, прызначаны для фермераў Заходняга Негева.

Навінка абсталяваная браніраванай канструкцыяй, здольнай абараніць вадзіцеля ад стральбы з лёгкай зброі, а таксама ад асколкаў мінамётных снарадаў. Тварэнне «Міфрам» — гэта браніраваная абалонка, якую можна лёгка падагнаць пад любую мадэль трактара. Яна накрывае кабіну трактара, пры гэтым не ствараючы нязручнасцяў вадзіцелю. Калі патрэбы ў брані няма, гэтая «ахоўная клетка» проста здымаецца з кузава або перастаўляецца на іншы трактар. Новае вынаходніцтва павінна прыйсціся па душы фермерам пасёлкаў, прылеглых да сектара Газа, якія дагэтуль карысталіся трактарамі, абсталяванымі супрацькулявой бранёй, пры тым, што ніякай гарантыі вытворцы не давалі.

**Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.**

